ЯК НАРАДЗІЦЬ ПАСЛЯ 40+

Сямейная газета

АКАДЭМІК, БІЁЛАГ, ПРАБАБУЛЯ

Сямейная газета

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

20 СТУДЗЕНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 12 (29634)

ЦЫТАТА ДНЯ

Таццяна ШЭНДЗІК, начальнік галоўнага ўпраўлення інфармацыйнай палітыкі і грамадскага развіцця Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Студатрадаўскі рух — гэта выхаванне праз працу. Праца рэальная і ва ўсіх сэнсах карысная для маладога чалавека, дзяржавы, грамадства ў цэлым. У студатрадах моладзь набывае прафесійныя навыкі, усведамляе цану ўзаемадапамогі і калектыўнай адказнасці, вучыцца пераадольваць сябе і ў канчатковым выніку — атрымлівае грошы. Так, гэтую форму работы з моладдзю мы ўзялі з савецкага перыяду, даверылі БРСМ, забяспечылі дзяржаўнае суправаджэнне. Але час ідзе, мяняюцца ўмовы, у якіх мы з вамі жывём. Развіваюцца тэхналогіі, з'яўляюцца новыя формы гаспадарання, ускладняюцца ўзаемаадносіны паміж дзяржавай і ўласнікамі прадпрыемстваў, што патрабуе ўдасканалення механізма стварэння і дзейнасці студатрадаў, у тым ліку і прававога. Таму і студатрадаўскі рух неабходна ўбудоўваць у новыя рэаліі, новыя ўмовы».

«Іардань» у Заазер'і

Напярэдадні Вадохрышча на сажалцы аграсядзібы «Спадчына» ў вёсцы Заазер'е Сенненскага раёна высеклі палонку ў выглядзе крыжа, запрасілі благачыннага Сенненскай акругі настаяцеля храма Святога Мікалая протаіерэя Мікалая ВАЛАДЗЬКО. Святар здзейсніў набажэнства і асвяціў ваду, пакрапіў свянцонаю вадою ўдзельнікаў святочнай падзеі. Кожны год гаспадар аграсядзібы Уладзімір ВІЛЬЧЫНСКІ, кіруючыся хрысціянскімі традыцыямі, імкнецца зрабіць гэты дзень асаблівым для вёскі, сяброў і гасцей, якія шануюць набожную народную традыцыю ды акунаюцца ў «іарданскую» палонку. І заўсёды запрашае айца Мікалая здзейсніць абрад асвячэння.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

(Вялікі фотарэпартаж пра Вадохрышча ў Заазер'і глядзіце на сайце zviazda.by)

КАРОТКА

- ДАІ Мінска ўзмоцніць кантроль за бяспекай пешаходаў у цёмны час сутак.
- **БРСМ плануе запусціць новыя працоўныя праекты на МАЗе і МТЗ.**
- Банк развіцця ў 2022 годзе зможа выпусціць аблігацыі на Br2,6 млрд.
- **Аранжавы ўзровень небяспекі аб'яўлены ў Беларусі 20 студзеня з-за моцнага ветру.**

ISSN 1990 — 763X

Давайце падлічым!

ЗАРПЛАТЫ, ПЕНСІІ, ДАПАМОГІ...

Што сёлета зменіцца ў мерах сацыяльнай падтрымкі?

З 1 студзеня ў Беларусі на 9,5 % вырас сямейны капітал для сем'яў, дзе нараджаецца трэцяе і наступныя дзеці, цяпер ён складае 25 995 рублёў. Павысіліся з пачатку гэтага года і мінімальная заработная плата, памер базавай стаўкі, а разам з ёй зарплата бюджэтнікаў, а таксама базавая велічыня, якая ўплывае на стыпендыі, дапамогі, дадаткі, штрафы і іншыя выплаты, у прыватнасці, дапамогу беспрацоўным. З'явіцца ў 2022-м у сацыяльным блоку і такая навела, як добраахвотнае страхаванне дадатковай накапляльнай пенсіі. Мы паглядзелі, як сёлета зменяцца пенсіі, заробкі, бюджэт пражыткавага мінімуму, дзіцячыя дапамогі і як будзе выглядаць сацыяльная падтрымка.

СТАР. 2

Прыкметы часу

ЗНАЙСЦІ ДРУГУЮ

Дзе падпрацаваць пасля Новага года?

Што рабіць, каб грошай хапала? Перастаць марыць і пачаць больш працаваць. Нават, знайшоўшы яшчэ адну работу. Для тых, хто задаўся такой мэтай, — наш матэрыял.

СТАР. 13

ЗАРПЛАТЫ, ПЕНСІІ, ДАПАМОГІ...

Сямейны капітал павялічыўся, а мэты яго выкарыстання пашырыліся

У 2022 годзе на фарміраванне сямейнага капіталу будзе накіравана 379,7 мільёна рублёў, паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. У Беларусі жыве 117,5 тысячы шматдзетных сем'яў.

З 1 студзеня пашыраны і магчымасці датэрміновага выкарыстання сямейнага капіталу.

— Пры паляпшэнні жыллёвых умоў сродкі сямейнага капіталу можна датэрмінова выкарыстоўваць на набыццё доляў або долі жылога памяшкання, таксама на пагашэнне пазыкі, выдадзенай арганізацыяй па месцы работы на набыццё жылля, яго будаўніцтва або рэканструкцыю, — расказала **начальнік управлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана БЕЛАШ.** — Датэрмінова можна выкарыстоўваць сродкі сямейнага капіталу на пагашэнне крэдытаў, выдадзеных банкамі па дагаворах аб пераводзе доўгу і прыёме запазычанасці, калі такія крэдыты выдаваліся таксама на мэты будаўніцтва, рэканструкцыі, набыцця жылля. Важна разумець, што пры паляпшэнні жыллёвых умоў сродкі сямейнага капіталу могуць быць выкарыстаны толькі грамадзянамі, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Пашыраны магчымасці датэрміновага выкарыстання сямейнага капіталу і на атрыманне адукацыі. Нарэшце з дзяржаўнымі ўстановамі адукацыі сродкі можна выкарыстоўваць датэрмінова ў вышэйшых навучальных установах, сярэдніх навучальных установах спажыўкааперацыі Беларусі, а таксама ў вышэйшых навучальных установах Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Пашыраны напрамкі для атрымання платных медыцынскіх паслуг. Цяпер сямейны капітал можна скарыстаць датэрмінова пры правядзенні высокатэхналагічных умяшанняў у артапедыі. Таксама з 1 студзеня 2022 года яго можна патраціць на набыццё тавараў, прызначаных для сацыяльнай рэабілітацыі і інтэграцыі інвалідаў, дзяцей-інвалідаў, якія маюць парушэнне слыху або апорна-рухальнага апарату.

Разам з тым уведзены і некаторыя абмежаванні. Напрыклад, пры будаўніцтве, рэканструкцыі, куплі жылля з выкарыстаннем сродкаў сямейнага капіталу грамадзяне, члены іх сем'яў будуць здымацца з чаргі на паляпшэнне жыллёвых умоў. Таксама ўведзена забарона на адчужэнне жылых памяшканняў, набытых з выкарыстаннем сродкаў сямейнага капіталу, у тым ліку калі гэтае памяшканне набывалася ў крэдыт. Нельга набыць з выкарыстаннем сродкаў сямейнага капіталу дом, які ўключаны ў рэестр старых і пустых дамоў. Усё гэта зроблена для таго, каб людзі больш узважана падыходзілі да распараджэння гэтымі сродкамі.

Як будзе праводзіцца індэксацыя?

Індэксацыя сямейнага капіталу праводзіцца штогод, пачынаючы з 1 студзеня 2021 года. Так, у перыяд з 1 студзеня да 31 снежня 2021 года сямейны капітал складаў 23 737,5 рубля. З 1 студзеня 2022 года ён праіндэксаваны і павялічыўся на 9,5 %. Такім чынам, на дзяцей, якія нарадзіліся і народзяцца ў перыяд з 1 студзеня да 31 снежня 2022 года, сямейны капітал будзе прызначацца ў памеры 25 995 беларускіх рублёў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дэпазітныя рахункі «Сямейны капітал» у краіне адкрылі 108,4 тысячы шматдзетных сем'яў. Рашэнне аб датэрміновым распараджэнні сямейным капіталам прынялі 47 тысяч сем'яў. Як правіла, сродкі сямейнага капіталу накіроўваюцца на паляпшэнне жыллёвых умоў — 87 %, яшчэ 6 % траціць сродкі на паслугі ў сферы адукацыі, 7 % — на медыцынскія мэты.

«Мінімалка» і заробак бюджэтнікаў выраслі са студзеня

Цяпер мінімальная заработная плата складае 457 рублёў. Вырас і памер зарплаты ў бюджэтнікаў. З 1 студзеня 2022 года базавая стаўка павысілася да 207 рублёў (на 4,5 %). Прынятае рашэнне закранае каля 850 тысяч работнікаў бюджэтнай сферы. Нагадаем, ад базавай стаўкі, якая з'яўляецца асноўным элементам тарыфнай сістэмы, залежыць аплата працы работнікаў бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый.

І гэта не адзінае ў 2022-м павышэнне базавай стаўкі. Згодна з прагнозам асноўных параметраў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2022 год, яе павелічэнне плануецца ў два этапы. Запланавана і павышэнне памеру дадатковых галіновых надбавак у адукацыі, культуры, сацыяльным абслугоўванні, фізічнай культуры і спорце. На гэта дадаткова патрацяць 327,6 мільёна рублёў.

Так, са студзеня ўжо вырасла зарплата ў сацыяльных работнікаў. Памер павелічэння склаў ад 41 да 186 рублёў. У далейшым надбаўка будзе павялічвацца прапарцыянальна росту базавай стаўкі.

Акрамя таго, для работнікаў бюджэтнай сферы з пачатку года павялічваецца аднаразовая выплата на аздараўленне — з 0,5 да аднаго акладу. На гэтыя мэты запланавана патраціць 120 мільёнаў рублёў.

Як будзе мяняцца бюджэт пражытковага мінімуму?

У студзені памер бюджэту пражытачнага мінімуму (БПМ) складае 288 рублёў. Сёлета запланаваны штоквартальны яго пералік — з лютага, мая, жніўня і лістапада. З яго павелічэннем будуць мяняцца і тыя выплаты, якія залежаць ад памеру БПМ — дзяржаўныя дапамогі сем'ям, што выхоўваюць дзяцей; павышэнні да пенсій асобных катэгорый пенсіянераў; даплаты і надбаўкі пенсіянерам ва ўзросце 75 гадоў і старэйшым, якія атрымліваюць пенсіі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне; дапамогі па доглядзе інвалідаў першай групы ці асоб, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту; сацыяльныя пенсіі.

Новае ў пенсіённай сістэме

На выплату пенсій у 2022 годзе плануецца накіраваць 16,1 мільярда рублёў. Як мы адзначалі, у сувязі з пералікам БПМ у лютым, маі, жніўні і лістападзе павысяцца пенсіі ў асобных катэгорый пенсіянераў, сацыяльныя пенсіі, вырастуць надбаўкі пенсіянерам з 75 гадоў і старэйшым, а таксама дапамогі па доглядзе інвалідаў першай групы і асоб, якія дасягнулі 80 гадоў.

З кастрычніка пачне працаваць дабраахвотнае страхаванне дадатковай накапляльнай пенсіі, або праграма «3+3». Яе сэнс у тым, што са свайго заробку работнік можа штомесяц адлічваць ад 1 да 10 % на накапляльны рахунак. Работадаўца адпаведна, накіроўвае туды ад 1 да 3 % (калі работнік — 1 %, то і работадаўца столькі ж, калі 2 % — работадаўца таксама 2, калі работнік адлічвае ад 3 да 10 % — работадаўца адлічвае 3 %). Самай аптымальнай лічыцца схема «3+3». Пры гэтым работніку, які вырашыў удзельнічаць у дадзенай праграме, да выхаду на пенсію мусіць заставацца не менш чым тры гады. Назапашаныя на асабістым рахунку сродкі ён можа атрымліваць у якасці дадатку да сваёй асноўнай пенсіі на працягу пяці або дзесяці гадоў. Займацца добраахвотным страхаваннем дадатковай накапляльнай пенсіі будзе дзяржаўная кампанія «Стравіта».

Праграма дазволіць грамадзянам павысіць узровень пенсіі ў старасці, павялічыць зберажэнні за кошт дзяржаўнай падтрымкі (бо адлічэнні абавязкова робіць і работадавец), атрымаць фінансавыя стымулы: ільготу па падаходным падатку, магчымасць наследавання пенсіённых зберажэнняў.

Дзіцячыя дапамогі

На выплаты дзіцячых дапамог у бягучым годзе плануецца накіраваць 2,7 мільярда рублёў. Яны прызначаны на 440 тысяч маленькіх беларусаў.

Дапамога па доглядзе дзіцяці да трох гадоў у студзені складае 496 рублёў, на другога і наступнага дзяцей да трох гадоў — 567 рублёў, дапамога на дзіця-інваліда — 637 рублёў. Перараразлік дзіцячых дапамог адбудзецца ў лютым і жніўні.

Аднаразовая дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці складае пакуль што 2 880 рублёў, другога — 4032 рублі. Яе перараразлік адбудзецца ў сувязі са зменаннем БПМ у лютым, маі, жніўні і лістападзе.

Колькі дзяржава накіруе на сацыяльную падтрымку?

На арганізацыю даступнага асяроддзя ў 2022-м мяркуецца выдаткаваць 114,1 мільёна рублёў. Да Дня Перамогі на выплаты ветэранам Вялікай Айчыннай вайны накіруюць 11 мільёнаў рублёў. Дадатковая сацпадтрымка ветэранаў, адзінокіх пажылых людзей і інвалідаў абыдзецца ў 1,1 мільёна рублёў. На забеспячэнне тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі запланавана патраціць 50 мільёнаў рублёў, аздараўленне пажылых грамадзян і інвалідаў у санаторыях Міністэрства працы і сацыяльнай абароны — 13,2 мільёна рублёў. Дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога абыдзецца бюджэту ў 126,5 мільёна рублёў.

Алена КРАВЕЦ.

Імпартазамяшчэнне

Нам пара навучыцца хваліць свае «пернікі», бо яны не горшыя, чым замежныя

Пра тое, што на ўнутраным рынку краіны дастаткова харчовай сыравіны і якасных прадуктаў, заявіў першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар БРЫЛО падчас адкрытай канферэнцыі айчынных вытворцаў прадуктаў з прадстаўнікамі рытэйлу.

Як вядома, наша краіна з першых дзён гэтага года ў адказ на санкцыі ўвяла харчовае эмбарга на шэраг тавараў з дзяржаў, якія ажыццяўляюць недружалюбныя дзеянні ў дачыненні да Беларусі.

Першы намеснік міністра адзначыў, што ўведзенае эмбарга практычна ніяк не паўплывае на запаўненне айчыннага харчовага рынку. Ён заўважыў, што ў краіне не толькі дастаткова сыравіны, у нас яе нашмат больш за ўнутранае спажыванне. «На сёння ў нас больш за 400 найменняў цвёрдых і паўцвёрдых сыроў. Краіна вырабляе за год каля 250 тысяч тон такіх сыроў, а за мінулы год мы імпартавалі іх 1,4 тысячы тон. Так што лічбы несупастаўныя, і нельга сказаць, што хто-небудзь з нашых спажыўцоў нешта страціў», — запэўніў Ігар Брыло.

Ён таксама закрануў тэму імпартазамяшчэння мясной прадукцыі. «Напэўна, выключаюць цікавасць перш за ўсё рознага кшталту прадукты — хамон і іншыя. Па выніках мінулага года мы завезлі ў краіну ўсяго толькі 20 тон такога прадукту, а вырабілі каля 480 тон. Так што на сталах будзе беларуская мясная прадукцыя, якая не саступае імпартнай па якасці», — адзначыў першы намеснік міністра.

Асобна ён спыніўся на павелічэнні экспарту сельгаспрадукцыі за мінулы сезон. «Па выніках мінулага года мы экспартавалі прадукцыю АПК на рэкордную суму. Год закрыем з лічбай практычна ў 6,5 мільярда доларaў. Атрымаецца амаль 700 мільёнаў долараў плюс да ўзроўню папярэдняга года», — сказаў Ігар Брыло. Паводле яго слоў, на 12 % вырас экспарт у краіны СНД (уключаючы Расію), на 42 % — у краіны далёкага замежжа.

Варта адзначыць, што ў 2020 годзе экспарт сельгаспрадукцыі склаў 5,8 мільярда доларaў, а па выніках пяцігодкі плануецца дасягнуць лічбы ў 7 мільярдаў доларaў.

Учора ў Мінску праходзіў Trade Dialog (адкрытая канферэнцыя) айчынных вытворцаў прадуктаў з прадстаўнікамі рытэйлу і HoReCa (так званы сегмент гасціннасці, які аб'ядноўвае кафэ, рэстараны, турыстычны і гасцінічны бізнес). Галоўная тэма размовы — імпартазамяшчэнне. У праграме мерапрыемства адбылася прэзентацыя і бізнес-дэгустацыя айчынных сыроў, а таксама мясных далікатэсаў. Па выніках дэгустацыі прайшлі прамыя перагаворы вытворцаў з прадстаўнікамі рытэйлу і HoReCa. У гэты ж дзень на пляцоўцы прайшоў круглы стол з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю і Мінсельгасхарча, падчас якога вырашаліся тэхнічныя пытанні, каб паскорыць працэс імпартазамяшчэння.

У заключэнне Ігар Брыло агучыў асноўную мэту адкрытай канферэнцыі — сабраць рэстараны і гасцінічны бізнес, які працаваў з імпартнай сыравінай, і паказаць, наколькі смачныя нашы сыры і мясныя далікатэсы, наколькі шырокі асартыментны пералік, які мы выпускаем. І праўда, нам пара навучыцца хваліць нашы «пернікі», бо яны не горшыя за замежныя.

Сяргей КУРКАЧ.

Кантэкст

Шмат слоў, а праўды мала

Палякі распаўсюджваюць непраўдзівую інфармацыю наконт інцыдэнту на граніцы

Днямі падчас праверкі рэжыму Дзяржаўнай граніцы беларускія пагранічнікі выявілі пашкоджанні пагранічнага слупа нашай краіны. На шчытку з выявай дзяржаўнага герба і таблічцы з нумарам, паведамілі ў Дзяржаўным пагранічным камітэце, зафіксаваныя прабоіны, па папярэдняй інфармацыі, ад металічных шарыкаў, знойдзеных каля слупа.

Здарэнне расследуецца апаратам пагранічных упаўнаважаных. Прававую ацэнку сітуацыі дасць следча-аператыўная група. Аб інцыдэнце праінфармаваны польскі бок. Аднак нашы суседзі распаўсюджваюць ілжывую інфармацыю адносна пашкоджання пагранічнага знака.

«Па факце пашкоджання 17 студзеня пагранічнага слупа беларускі бок своечасова апавясціў польскіх калег праз аператыўна-дзяжурную службу, а таксама па лініі пагранічных упаўнаважаных, — заявілі ў Дзяржпагранкамітэце. — Гэтую інфармацыю пагранварта Польшчы публічна пацвердзіла. Акрамя дадзенага інцыдэнту, 15 студзеня беларускім бокам была зафіксавана адсутнасць шчыткоў з гербамі яшчэ на трох пагранічных слупах, аб чым таксама праінфармаваны польскія прадстаўнікі па ўсіх каналах. Згодна з двухбаковымі дамоўленасцямі, кожны бок абавязаны паведаміць сумежнаму боку аб назіраемых фактах пашкоджанняў знакаў або іх элементаў. Польскія ваеннаслужачыя, якія візуальна назіралі пашкоджанні або адсутнасць шчыткоў на беларускіх пагранічных слупах, ні ў адным з выпадкаў не інфармавалі беларускі бок».

Як адзначылі ў ведамстве, ва ўмовах пандэміі COVID-19 рабочыя сустрэчы па такога кшталту сітуацыях апошнім часам не праводзяцца. Урэгуляванне пагранічных інцыдэнтаў ажыццяўляецца ў межах перапіскі апарату пагранічных упаўнаважаных. Польшча мэтанакіравана надае гэтаму інцыдэнту інфармацыйны імпульс, падкрэсліваюць у Дзяржпагранкамітэце Беларусі, выкарыстоўваючы ўласную праверaную тактыку, — больш укідаў і менш праўды.

Вераніка КАНЮТА.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў смуткуюць у сувязі са смерцю вядомага дзяржаўнага дзеяча старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання, дэпутата Палаты прадстаўнікоў другога склікання МАЛАФЕЕВА Анатоля Аляксандравіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю МАЛАФЕЕВА Анатоля Аляксандравіча, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

«ЛЁС БЕЛАРУСІ ПАВІНЕН ВЫРАШАЦЦА Ў КАБІНАХ ДЛЯ ГАЛАСАВАННЯ, А НЕ НА ВУЛІЦАХ»

Работнікі сістэмы сацыяльнай абароны Міншчыны прынялі ўдзел у дыялогавай пляцоўцы па абмеркаванні праекта змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Мерапрыемства арганізаваў камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама.

АДНАДУМЦЫ НЕ ТЫЯ, ХТО ДУМАЕ АДНОЛЬКАВА

Сваімі меркаваннямі аб праекце Асноўнага Закона краіны падзяліўся з прысутнымі **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, культуры і навуцы Ігар МАРЗАЛЮК:**

— Мая любімая фраза з Канфуцыя: аднадумцы — гэта не тыя, хто думае аднолькава, а тыя, хто думае аб адным. Важнасць дыялогу заключаецца ў тым, што гэта — прамыя зносіны розных сацыяльных груп насельніцтва, магчымасць прыйсці да кансэнсусу. Важна слухаць і чуць людзей. І самае галоўнае, што рэферэндум — гэта прамое дзеянне, самая дэмакратычная форма камунікацыі розных слаёў насельніцтва. Упэўнены, што рэферэндум — найважнейшая кампанія, якая вызначыць стратэгію будучыні краіны. І яна важная для кожнага чалавека незалежна ад сацыяльнага становішча, статусу, — лічыць Ігар Аляксандравіч.

У любога грамадства ёсць толькі два шляхі развіцця — эвалюцыйны або катастрафічны рэвалюцыйны. Дзяржава прапануе праз папраўкі ў Канстытуцыю менавіта эвалюцыйны метад, падкрэсліў Ігар Марзалюк. «Лёс Беларусі павінен вырашацца ў кабінах для галасавання, а не на вуліцах. Слова, прагаворанае тысячу разоў, адшліфаванае ў праекце, лепшае, больш важнае і эфектыўнае, чым нападкі, зневажанні, прыніжэнні. Усе, хто за салідарнасць, нармальнае развіццё дзяржавы, павінны падтрымаць праект», — упэўнены ён.

САЦЫЯЛЬНАЯ АБАРОНА ГАРАНТАВАНА

Што датычыцца сацыяльных гарантый шматдзетным, пенсіянерам, інвалідам, маламаёмасным і іншым неабароненым катэгорыям грамадзян, яны прапісаны ў праекце. Раней падобнага артыкула не было ў Асноўным Законе ні БССР, ні Рэспублікі Беларусь.

Сацыяльная сістэма Беларусі адна з самых эфектыўных і якасных. Ёсць краіны, дзе пенсій не плацяць наогул, хоць іх унутраны валавы прадукт большы, чым у Беларусі. Напрыклад, Кітай толькі пачынае разгортваць сваю сацыяльную сістэму. Там мінімальны працэнт насельніцтва мае пенсію, як правіла, дзяржаўныя служачыя. У нашай краіне гарантавана бясплатнае медыцынскае абслугоўванне, але многія нават не ўяўляюць, колькі гэта каштуе для краіны, не ведаюць, што мільёны людзей на зямлі гэтага пазбаўлены. Беларуская дзяржава разумее, што толькі тая краіна годная павагі, калі ў ёй належным чынам ставяцца да дзвюх самых неабароненых катэгорый — дзяцей і састарэлых. «Наша сацыяльная сістэма павінна развівацца, мы можам запазычыць нейкія элементы ў кагосьці. Але іншыя павінны вучыцца ў нас, а не мы. Мы павінны пазбаўляцца комплексаў непаўнавартасці. Мы больш паспяхова рэалізоўваем сацыяльныя гарантыі. І чалавек ведае, што ў цяжкай сітуацыі ён не будзе пакінуты сам-насам, не будзе выкінуты за межы соцыуму», — удакладняе Ігар Марзалюк.

«Тыя сацыяльныя гарантыі, якія ёсць у заканадаўстве, людзі просяць захаваць. Вельмі добра ўспрымаецца артыкул, звязаны з правамі інвалідаў. Магчыма, нехта хацеў бы большай канкрэтызацыі, больш дэталёвага раскладу наконт дадатковых праў і льгот. Але нагадаю, што Канстытуцыя — гэта стратэгія. Стратэгія закладзена, а пасля таго, як мы прымем Канстытуцыю, будзем працаваць над асобнымі законамі, дэталізацыяй прысутных дэкларацый, якія ёсць у дзеючым Асноўным Законе», — падкрэсліў парламентарый.

НАСТУПНЫ ЭЛЕМЕНТ САЦЫЯЛЬНАЙ ЭВАЛЮЦЫІ

Ігар Марзалюк таксама абгрунтаваў неабходнасць абноўленай Канстытуцыі.

— Мы шмат зрабілі за 25 гадоў, пабудавалі інстытуты ўлады. Канстытуцыя, па якой жывём, была антыкрызіснай, мы выйшлі з таго маргінальнага стану 1990-х, калі былі зарплаты па 10 доларaў, калі чалавека маглі пазбавіць жыцця за патрыманую іншамарку, калі не было законаў. Мы гэтыя рэчы прыбралі з жыцця. У нас цяпер ёсць сярэдні клас, абсалютна легальныя доларавыя мільянеры. Наступны элемент сацыяльнай эвалюцыі — далейшае развіццё і ўдасканаленне палітычнай сістэмы. Стварэнне сацыяльных магчымасцяў для тых, хто хоча прымаць удзел у жыцці грамадства праз выбары. Новы праект Канстытуцыі гэта дазваляе. Мы гатовы да дыялогу з усімі зацікаўленымі групамі, у тым ліку і з апанентамі ўлады. Не лічацца апанентамі тыя, хто марыць аб грамадзянскай вайне, пры дапамозе напалма, дыверсійных і тэрарыстычных актаў хоча разбурыць дзяржаву. Гэта ворагі, з якімі можна размаўляць на мове Адміністрацыйнага, Крымінальнага кодэксаў. Усе астатнія маюць права прымаць удзел у дыялогу, будаваць сваю краіну і рабіць яе лепш, — кажа Ігар Марзалюк.

Ён зазначае, што наступны этап пасля рэферэндуму — прыняцце законаў. Першы закон — аб Усебеларускім народным сходзе ў двух чытаннях на працягу года, папраўкі ў выбарчы кодэкс, удасканаленне закона аб палітычных партыях. Новы праект Канстытуцыі выбудаваны так, што ў выпадку неабходнасці, жаданне можна пераходзіць і на іншыя схемы галасавання — на змешаную і прапарцыянальную сістэмы.

Фота БелТА.

— Самае галоўнае, што мы павінны разумець адну рэч — праект Канстытуцыі мы робім для сябе. Не для дзядзькі, каб яму спадабацца. Гэта наша краіна, за якую мы нясём адказнасць. Другога шанцу пабудаваць і ўмацаваць нацыянальную незалежную дзяржаву ў нас не будзе. Таму кожны павінен асэнсоўваць меру сваёй адказнасці і памятаць, што правоў без абавязкаў не бывае, — сцвярджае Ігар Марзалюк.

НОВАЕ НА КАРЫСЦЬ ЛЮДЗЕЙ

«Сёння пытанні па змяненнях у Канстытуцыю абмяркоўваюць усе. Размова не ідзе пра тое, што дзеючая Канстытуцыя дрэнная. А менавіта пра тое, што з улікам часу неабходна ўносіць у яе нешта новае на карысць людзей. Асабіста мне імпануе, што захаваныя сацыяльныя гарантыі, што Усебеларускі народны сход атрымлівае прававы статус — не толькі правы, але і абавязкі. Мяне цікавіць, у прыватнасці, артыкул 80. Лічу, што трэба яго дапоўніць у сувязі з тым, што сёння ў нас ёсць людзі, якія не маюць афіцыйных даходаў, не ўдзельнічаюць у эканоміцы, фарміраванні бюджэту краіны. Яны не павінны прэтэндаваць на пост кіраўніка дзяржавы, бо не ведаюць, як грошы зарабляюцца і як расходуюцца», — выказала сваё меркаванне **намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Жодзінскага гарвыканкама Любоў РАДАШКЕВІЧ.**

Дырэктар Краснаслабадскога псіханеўралагічнага інтэрната для састарэлых і інвалідаў Наталля КРАВЕЦ дадала:

— Асабіста ад сябе і ўсяго калектыву скажу, што ў такі няпросты час гэтыя папраўкі неабходныя. Асноўны іх сэнс — сцвярджэнне базавых прынцыпаў сацыяльнай абароны нашай краіны і народа. Калектыўнае абмеркаванне дапаўненняў і змяненняў у Асноўны Закон на дыялогавых пляцоўках паказвае ўсяму свету, што менавіта народ Беларусі выступае за гэтыя папраўкі.

Па словах Наталлі Кравец, да нядаўняга часу ў грамадстве складвалася тэндэнцыя, што інваліды — сацыяльна абдзеленыя людзі. Сацыяльныя работнікі практычна жывуць на рабоце, сярод гэтых грамадзян. І ёй падабаецца, што ў праекце Канстытуцыі не забыліся пра людзей з абмежаванымі магчымасцямі, іх інтэграцыю ў грамадства.

— Гэта людзі, якія душой нашмат цяплейшыя за нас, яны нас саграваюць і робяць дабрэйшымі, — сказала ў заключэнне дырэктар інтэрната.

Таццяна ГЕОРГІЕВА.

Уладзімір КУХАРАЎ:

«Наша моладзь мабільная і крэатыўная»

Старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў сустрэўся са студэнцкай моладдзю. Студэнты вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў задалі кіраўніку горада мноства разнастайных і цікавых пытанняў. Мадэратарамі сустрэчы выступілі начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Вольга Чамаданава і генеральны дырэктар агенцтва «Мінск-навіны» Андрэй Крывашэеў, якія таксама актыўна далучаліся да размовы.

Цэнтральнай тэмай стаў праект змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Прычым маладых людзей цікавілі самыя розныя прапановы. Так, прагучала пытанне аб тым, ці мяркуецца перагляд праграм вывучэння гісторыі ў школе ў сувязі з унясеннем папраўкі ў Асноўны Закон аб забеспячэнні захаванасці гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Маладых людзей зацікавіла, чаму з Канстытуцыі можа быць прыбраны пункт аб бяз'ядзерным статусе Беларусі. Вялікую цікавасць і бурнае абмеркаванне выклікала пытанне аб выглядзе сістэмы ўлады пасля ўнясення паправак у Асноўны Закон. І асабліваю ўвагу ўдзялілі Усебеларускаму народнаму сходу і яго будучым паўнамоцтвам.

На сустрэчы былі агучаны не толькі актуальныя пытанні, але і незвычайныя прапановы. Адна з іх — запуск праекта «Супрацоўнік на тыдзень», у рамках якога студэнт можа тыдзень працаваць у Мінгарвыканкаме ці адміністрацыі пэўнага сталічнага раёна, на свае вочы ўбачыць сутнасць і нюансы дзяржаўнай службы і многаму навучыцца.

«Гэта трэба зрабіць! Мы гатовы даць магчымасць атрымаць вопыт дзяржаўнай працы зацікаўленым студэнтам. Прыходзьце да нас — пакажам, раскажам і дадзім магчымасць сябе праявіць. Нам патрэбны прафесіяналы, якія прайшлі сур'ёзную практычную падрыхтоўку падчас вучобы», — заявіў Уладзімір Кухараў.

Падводзячы вынікі сустрэчы, кіраўнік сталіцы адзначыў, што яго маладыя суразмоўнікі задавалі вельмі ўдумлівыя пытанні. Паводле яго слоў, гэта сведчыць аб тым, што моладзь неабыякавая да ўсяго, што адбываецца навокал. «Наша моладзь мабільная, крэатыўная, і многія прапановы, якія сёння прагучалі, нас зацікавілі. Вельмі радуе, што маладыя людзі задаюць пытанні са сваім бачаннем праблемы. І часта яны прапаноўваць уласнае рашэнне, што для нас вельмі важна. У нас запланаваны шэраг сустрэч, якія мы павінны правесці, каб ведаць запыты моладзі, пытанні, якія іх хвалююць. Для нас гэта вельмі важна, іх рашэнні будуць улічвацца», — расказаў Уладзімір Кухараў.

Валерыя СЦЯЦКО.

ДАСЛОЎНА

Старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі прафсаюза Белэнергапаліўгаз Дзяніс ЛЫШОЎ:

— Да абмеркавання далучылася шырокае кола грамадства: ад работнікаў усіх сфер дзейнасці да пенсіянераў і вучнёўскай моладзі. Мы вызначаем чарговую кропку росту. Усё гэта сведчыць аб тым, што беларусам неабыякава, у якой дзяржаве будзем жыць заўтра, які вектар вызначыць Беларусь у сваім далейшым развіцці. Мы бачым, як хутка мяняецца свет вакол. Наспеў час уносіць змяненні ў прававы фундамент нашай дзяржавы. Напярэдзе новы этап развіцця Беларусі. Ад таго, наколькі актыўна мы, беларусы, далучымся да ўдзелу ў рэферэндуме, будзе залежаць заўтрашні дзень краіны. Гэта асабліва важна ў святле сённяшніх грамадска-палітычных працэсаў. Мы бачым, што грамадства гатова да змяненняў. І зараз асабліва важна зрабіць правільны выбар, свядома падысці да змяненняў і дапаўненняў, якія прапануе новы праект Канстытуцыі. Іх нямала. Дапаўненні ўнесены больш чым у 80 артыкулаў, з'явілася 11 новых артыкулаў. Праект мацца ў шырокім доступе, кожны чалавек можа знайсці тэкст на інтэрнэт-парталах, у друкаваных СМІ.

Гэта дазваляе зрабіць уласны аналіз, максімальна ўзважана падысці да выбару будучага шляху краіны. Пры гэтым не варта забываць, што гэтым самым мы робім выбар і для будучых пакаленняў. Таму трэба прыслухацца не толькі да розуму, але і да сэрца.

Се СЯАЮН:

«СУПРАЦОЎНІЦТВА КІТАЯ І БЕЛАРУСІ — ПРЫКЛАД МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН НОВАГА ТЫПУ»

Беларусь і Кітай сёння адзначаюць адметную дату — 30-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін. Чым характарызуецца дынаміка двухбаковага супрацоўніцтва, чаму «Вялікі камень» стаў узорным праектам, што мае на ўвазе «жалезнае братэрства»? Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Се СЯАЮН расказаў аб плённым узаемадзеянні дзвюх краін.

— Чым характарызуюцца дынаміка і ўзровень кітайска-беларускага супрацоўніцтва?

— Кітайска-беларускае супрацоўніцтва вытрымала выпрабаванні міжнароднай абстаноўкі, якая імкліва змяняецца, яна заўсёды захоўвае жыццяздольнасць і дынаміку і дасягнула значных вынікаў у розных галінах. Нязменна ўмацоўваюцца палітычныя адносіны. Кітай — адна з першых краін, якія прызналі незалежнасць Беларусі і ўстанавілі з ёй дыпламатычныя адносіны. Кітайска-беларускія адносіны здзейснілі ўздым на новую ступень тройчы, ад «дружалюбных адносін супрацоўніцтва» да «адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства», а таксама да «адносін даверлівага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва».

Паміж нашымі краінамі бесперапынна ўмацоўваецца палітычны ўзаемадавер. Абодва бакі таксама стварылі дасканалыя механізмы супрацоўніцтва, у тым ліку Кітайска-Беларускі міжурадавы камітэт па супрацоўніцтве, і цесна ўзаемадзейнічаюць у міжнародных і рэгіянальных справах. Кітайскі бок заўсёды цвёрда падтрымлівае беларускі ў абароне яго дзяржаўнага суверэнітэту і нацыянальнай годнасці, выступае супраць умяшання знешніх сіл ва ўнутраныя справы Беларусі, неабгрунтаваных аднабаковых санкцый у адносінах да вашай краіны і паважае шлях развіцця, які абраны беларускім народам з улікам умоў і рэальнасці сваёй дзяржавы. Беларускі бок, у сваю чаргу, аказвае цвёрдую падтрымку кітайскаму па пытаннях, якія датычацца карэнных інтарэсаў Кітая, уключаючы пытанні, што закранаюць Тайвань, Сіньцзян, Сянган і гэтак далей.

Інтэнсіўна развіваецца эканамічнае супрацоўніцтва. Беларусь — адна з першых краін, якая адгукнуліся на кітайскую ініцыятыву «Адзін пояс, адзін шлях». Актыўна ўдзельнічае ў яе рэалізацыі. Абодва бакі выкарыстоўваюць гэтую магчымасць для ўсебаковага павышэння ўзроўню супрацоўніцтва ў такіх сферах як гандаль, інвестыцыі, навука і тэхналогіі, а таксама развіццё інфраструктуры. Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень» стаў найбуйнейшым замежным індустрыяльным паркам, пабудаваным з удзелам кітайскіх прадпрыемстваў. Ён з'яўляецца знакавым і ўзорным праектам плённага ўзаемадзеяння дзвюх краін у рамках сумеснай рэалізацыі ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях».

Пашыраецца і культурны абмен. Абодва бакі ўстанавілі дружалюбныя каналы сувязі паміж народамі, паспяхова правялі Год турызму і Год адукацыі, а таксама мноства мерапрыемстваў, такіх, як дні культуры, тыдні кіно, фотавыставы і шэраг іншых, паглыбляючы і прасоўваючы культурную інтэграцыю паміж двума народамі. У 2018 годзе афіцыйна ўступіла ў сілу міжурадавае пагадненне аб узаемным бязвізавым рэжыме для ўладальнікаў звычайных пашпартоў, што садзейнічала больш свабоднаму гуманітарнаму абмену паміж краінамі. Кітай і Беларусь падпісалі пагадненне аб узаемным прызнанні дакументаў аб адукацыі, а таксама аб вучоных ступенях, праводзяць сумеснае навучанне ў вышэйшых установах, пры гэтым колькасць студэнтаў з дзвюх краін павялічваецца з кожным годам. У Беларусі кітайская мова ўключана ў пералік пяці замежных моў, якія могуць быць абраныя абітурыентамі для праходжання цэнтралізаванага тэсціравання. Шэсць інстытутаў Канфуцыя і два класы Канфуцыя паспяхова функцыянуюць у вашай краіне. У Пекіне і Мінску створаны культурныя цэнтры і такім чынам пабудаваны сапраўдны гуманітарны мост, што дазваляе народам дзвюх краін лепш разумець адзін аднаго.

— Многія ключавыя аспекты нашага супрацоўніцтва абмяркоўваюцца на ўзроўні вышэйшага кіраўніцтва Беларусі і Кітая. Ці надае гэта дадатковы імпульс узаемадзеянню?

— Несумненна, дзякуючы асабістаму ўдзелу і пільнай увазе Старшыні КНР Сі Цзіньпіна і Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі кітайска-беларускія адносіны нарошчваюць інтэнсіўную дынаміку развіцця, двухбаковае супрацоўніцтва ў розных галінах

Фота БелТА.

бесперапынна паглыбляецца. На мінулым тыдні кіраўнікі дзяржаў паспяхова правялі тэлефонную размову і вызначылі стратэгічныя кірункі развіцця двухбаковых адносін. Сёння можна назваць нашы краіны сапраўды блізкімі палітычнымі, узаемавыгаднымі гандлёва-эканамічнымі, супрацьэпідэмічнымі і гуманітарнымі партнёрамі. У нас ёсць дастатковыя падставы меркаваць, што пад стратэгічным кіраўніцтвам Старшыні КНР і Прэзідэнта Беларусі, дзякуючы сумесным намаганням ведамстваў і сяброў з усіх колаў грамадства народы Кітая і Беларусі абавязкова будуць ісці поплеч, садзейнічаць стварэнню кітайска-беларускай супольнасці адзінага лёсу, сумесна мы адкрыем старонку наступных залатых дзесяцігоддзяў двухбаковых адносін.

— Вы назвалі «Вялікі камень» узорным праектам плённага ўзаемадзеяння дзвюх краін у рамках сумеснай рэалізацыі ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях». Як развіваецца індустрыяльны парк?

— За апошнія два гады індустрыяльны парк пераадолеў уплыў негатыўных фактараў, такіх, як пандэмія COVID-19, і захаваў станоўчую дынаміку развіцця. Тут працуюць 85 прадпрыемстваў з 15 краін свету з узгодненымі інвестыцыямі ў памеры больш чым 1,2 мільярда долараў. Сярод галін — машынабудаванне, біямедыцына, вытворчасць новых матэрыялаў, электронныя камунікацыі. Дзякуючы намаганням урадаў і прадпрыемстваў дзвюх краін ён мэтанакіравана ператвараецца ў перспектыўны індустрыяльны парк з умовамі інкубацыі для сучасных навукова-даследчых праектаў. Летась у канцы мая афіцыйна быў уведзены ў эксплуатацыю кітайска-беларускі інавацыйны цэнтр прамысловых тэхналогій, дзе паслядоўна здзяйсняецца прыцягненне інвестыцый для навукова-даследчых праектаў. «Вялікі камень» стаў першай пілотнай пляцоўкай па прымяненні 5G у Беларусі і першым выпрабавальным палігонам для беспілотных аўтамабіляў. Кітайскі бок гатовы працягваць працаваць разам з беларускім, прыкладаючы нястомныя намаганні для ператварэння індустрыяльнага парка ў міжнародны прамысловы і новы навукова-тэхнічны горад з поўнай інфраструктурай, выдатным экалагічным асяроддзем, трывалым прамысловым кластарам і перадавым тэхналагічным узроўнем.

— Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва нашых краін дасягнула значных вынікаў. Ці можна яшчэ больш спрасціць працэдуру выхаду беларускіх тавараў і паслуг на кітайскі рынак?

— Уклад Кітая ў сусветны эканамічны рост складае каля 30 працэнтаў, а патэнцыял росту спажывання велізарны. Пашырэнне імпарту — важная мера, якая садзейнічае якаснаму развіццю знешняга гандлю і фарміраванню адкрытай сусветнай эканомікі. Наша краіна заўсёды вітала выхад высакаякасных і канкурэнтаздольных замежных тавараў і паслуг на ўнутраны рынак і для гэтага стварыла шэраг адкрытых платформаў супрацоўніцтва, такіх, як Кітайскае міжнароднае імпартнае ЭКСПА, Кітайская міжнародная выстава гандлю паслугамі і Кітайскі кірмаш імпартных і экспартных тавараў (Кантонскі кірмаш). Правядзенне гэтых выстаў на высокім узроўні дае новыя магчымасці для экспарту з розных краін, уключаючы Беларусь, стварае платформу для дзяржаў, каб падзяліць дывідэнды развіцця Кітая, а таксама надае новы імпульс сусветнаму эканамічнаму росту.

У апошнія гады істытуцыянальныя механізмы, звязаныя са спрашчэннем працэдур гандлю паміж нашымі краінамі, увесь час удасканальваюцца. Бакі стварылі камісію па мытным і каранцінным супрацоўніцтве. Упершыню ў рамках камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве Кітайска-Беларускага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве была створана рабочая група па спрашчэнні гандлёвых працэдур. Цяпер планамерна вядуцца перагаворы па кітайска-беларускім пагадненні аб гандлі паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый. У далейшым прадоўжыцца работа па аптымізацыі выхаду беларускіх тавараў і паслуг на кітайскі рынак. Прадукцыя беларускага экспарту ў Кітай заўсёды адрозніваецца экалагічнасцю і высокай якасцю, асабліва малочныя прадукты, якія карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў нашых спажыўцоў.

— У чым сімвалізм тэрміну «жалезнае братэрства», які ўжываецца ў адносінах да кітайска-беларускага супрацоўніцтва?

— У кітайскай мове «жалезнымі братамі» мы часта называем тых блізкіх прыяцеляў і добрых сяброў, чые выдатныя адносіны можна апісаць як надзейныя і даверлівыя, што сімвалізуе непахіснае і нязломнае, нібыта жалеза, сяброўства паміж двума бакамі. На працягу апошніх 30 гадоў кітайска-беларускі стратэгічны ўзаемадавер бесперапынна паглыбляецца, дружба паміж двума народамі становіцца ўсё мацнейшай, пашыраецца супрацоўніцтва краін у розных галінах. Кітай і Беларусь падтрымліваюць цеснае ўзаемадзеянне ў міжнародных справах, аказваюць цвёрдую падтрымку адно аднаму па пытаннях, якія закранаюць карэнныя інтарэсы і важныя заклапочанасці абодвух бакоў, аказваюць адно аднаму дапамогу і падтрымку ў складаным міжнародным становішчы і сумесна працуюць над стварэннем кітайска-беларускай супольнасці адзінага лёсу, зацвердзіўшы тым самым узор для міжнародных адносін новага тыпу. Усё вышэйпералічанае з'яўляецца сапраўдным сведчаннем трывалай дружбы паміж Кітаем і Беларуссю, з прычыны чаго дарэчнае выкарыстанне тэрміну «жалезнае братэрства» для апісання адносін паміж дзвюма краінамі. Знаходзячыся на новым зыходным этапе гісторыі, кітайскі бок гатовы супрацоўнічаць з беларускім, прытрымліваючыся духу даверлівага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, каб бесперапынна прасоўваць кітайска-беларускія адносіны на больш высокі ўзровень, нязменна садзейнічаць усебаковаму, шматузроўневаму, шырокамаштабнаму ўзаемадзеянню, сумесна падтрымліваць міжнародны і рэгіянальны мір і стабільнасць на карысць народаў дзвюх краін.

Праз некалькі дзён мы ўступім у год Тыгра па кітайскім месячным календары. Кітайцы лічаць тыгра «царом звяроў», ён з'яўляецца ўвасабленнем сілы, жыццёвай энергіі, адвагі і магутнасці. Шчыра жадаю, каб адносіны паміж Кітаем і Беларуссю напоўніліся сілай тыгра і каб народы нашых краін былі энергічнымі, як тыгры. Я асабіста і ўвесь калектыў пасольства будзем па-ранейшаму сумесна з беларускімі сябрамі рашуча рэалізоўваць важныя дамоўленасці, дасягнутыя кіраўнікамі дзвюх краін па паглыбленні развіцця кітайска-беларускіх адносін, развіваць дружбу, раскрываць патэнцыял двухбаковага супрацоўніцтва і нязменна аказваць усю неабходную падтрымку і дапамогу для ўмацавання ўзаемадзеяння дзвюх краін.

З нагоды знакавай даты ў кітайска-беларускім супрацоўніцтве хацеў бы выказаць сардэчную падзяку і гарачыя віншаванні ўсім сябрам, якія клапоцяцца аб развіцці двухбаковых адносін і ўнеслі плённы ўклад ва ўзаемадзеянне дзвюх краін у розных галінах.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Сямейная газета

Выпуск № 1 (183)

РАЗМОВА СЭРЦАЎ

Выхоўваць у дзецях міласэрнасць, спачуванне, сумленнасць і прыстойнасць насамрэч няпроста. Можна гаварыць пра гэтыя важныя рэчы шмат, але сказаць так, каб тое ўразіла малое, — задача не з лёгкіх. Час ад часу жыццё падкідвае сітуацыі, калі дзіцячае сэрца раптам адкрываецца, і тады я імкнуся ператварыць тлумачэнне таго, што адбываецца, у размову сэрцаў. Вось і нядаўна, выходзячы з пад'езда, я затрымалася каля паштовай скрыні, а дзве сястры выбеглі на вуліцу.

Шасцігадовая Мялаша пільна глядзела на жанчыну, якая з цяжкасцю спускала па лесвіцы суседняга пад'езда каляску з хлопчыкам. Дзесяцігадовая Уля штурхнула яе ў бок:

— Ну чаго ты ўтаропілася, нельга так, цётцы Наташы, напэўна, непрыемна...

Я дагнала дзяўчынак. Мы павіталіся з суседкай, якая ўжо спусціла каляску і праходзіла міма. Мялаша не вытрымлівала і час ад часу абарочвалася, каб яшчэ раз паглядзець на хлопчыка ў калясцы.

— Мам, а чаму такі вялікі хлопчык ездзіць у калясцы?

— Ён інвалід, — паспяшалася адказаць Ульяна. — Інваліды не могуць хадзіць, не могуць самі есці, у іх абмежаваныя магчымасці. Ім трэба дапамагаць.

Ульяна знаёмая з суседкай Наталляй і яе сынам Кірылам, таму і ведае больш.

— Інваліднасць бывае розная, — паправіла я дачку. — Ды і абмежаванні ёсць рознымі, нават у здаровых людзей. — Ніхто не дасканалы, але калі ты не можаш быць паспяховым у адной сферы, не значыць, што ты ні на што не здольны ў іншай. Чалавек можа быць геніяльным фізікам, але пры гэтым для таго, каб перасоўвацца, яму патрэбная каляска, або, наадварот, можна дасягнуць поспехаў у спорце, але не атрымаецца дамагчыся падобнага ў навуках... Ёсць спявачка, у якой вельмі прыгожы голас, але пры гэтым яна невідушчая... Мы ўсе рознымі, з рознымі магчымасцямі і талентамі, і жывём на адной планеце. Трэба паспрабаваць жыць у згодзе з усімі і паводзіць сябе так, каб людзі з інваліднасцю не адчувалі сябе абдзеленымі ў параўнанні з фізічна здаровымі людзьмі, каб у іх таксама была магчымасць вучыцца, развівацца, працаваць і жыць паўнацэнным жыццём. Так будзе справядліва.

Дзяўчынкі нейкі час ішлі моўчкі. Мялаша парушыла цішыню:

— А адкуль бяруцца інваліды?

— Нехта нараджаецца з інваліднасцю, як Кірыл, а нехта становіцца інвалідам. Напрыклад, трапляюць у аварыю або ў выніку іншага няшчаснага выпадку або цяжкага захворвання. Інваліднасць можна атрымаць у любым узросце і ў розныя перыяды свайго жыцця. Таму так важна клапаціцца пра тое, каб ва ўсіх людзей — і з інваліднасцю, і без — былі дастойныя ўмовы жыцця і даступнае ды зручнае асяроддзе. Мы рознымі, але роўныя. Галоўнае — не даць сваёй душы стаць «інвалідам».

— Як гэта? — здзіўлена спытала Уля.

І тут я расказала пра Тоньку-кулямётчыцу. Дзяўчынкі з замірaннем сэрца слухалі страшную гісторыю маладой дзяўчыны па імені Антаніна (Гінзбург). Падчас Вялікай Айчыннай вайны яна трапіла спачатку ў Чырвоную Армію, працавала буфетчыцай, карміла салдат, якія абаранялі Радзіму. А потым пры наступленні нямецкіх войскаў аказалася ў палоне. Яе змясцілі ў спецыяльны лагер, але ёй удалося збегчы і... Дзяўчына пайшла ў іншы горад і нанялася на «работу» да фашыстаў: пагадзілася расстрэльваць сваіх суайчыннікаў, забівала людзей сотнямі, ні да каго не праяўляла літасці.

— Мам, няўжо ёй не было шкада гэтых людзей? — жахнулася Уля.

— Магчыма, і было шкада, але ёй так хацелася спаць у цёплым ложку, есці смачную ежу, купляць на свой заробак адзенне і духі... Тоня не хацела ваяваць, яна разумела, што гэта няправільна — служыць зладзеям. Але лічыла сябе невінаватай у тым, што фашысты асуджаюць людзей на смерць: яна проста добра і адказна выконвала сваю работу. Ёй удалося дамовіцца з сабой і жыць далей. Людзі, якія гатовыя свядома рабіць зло іншым, маюць сэрца з абмежаванымі магчымасцямі. Яны могуць адчуваць міласэрнасць, любоў, спагаду толькі тады, калі гэта не закранае іх асабістага дабрабыту. І ўжо не важна, здаровы чалавек ці не вельмі: іх душа па сутнасці — інвалід. Вось гэтага асцерагайцеся, бо такім чалавек становіцца не з-за вонкавых абставін, а толькі па сваёй волі.

Дзяўчынкі моцна прытуліліся да мяне. Мы яшчэ доўга ішлі моўчкі, было відаць, што малыя ўражаныя пачутым. А я радавалася, што мне давялося дастукацца да маленькіх сэрцаў і пагаварыць з імі.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Тыя, хто побач

Уладзімір МІШЧАНЧУК:

«Марым аб брыльянтавым вяселлі»

«Вечна тваім застанецца толькі тое, што ты аддаў» — так казаў Уладзімір Караткевіч. Гэтай думкі, гэтага выказвання прытрымліваецца ў жыцці і творчасці мой суразмоўнік — заслужаны артыст БССР, дэкан тэатральнага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, прафесар Уладзімір МІШЧАНЧУК. Яго творчае і асабістае жыццё цесна перапляліся. У шлюбе ён ужо больш за паўстагоддзя, сотні разоў выходзіў на сцэну разам са сваёй жонкай Людмілай Кучарэнкай. Цяпер яны — таксама разам — гадуюць новае пакаленне беларускіх тэатральных артыстаў.

— Уладзімір Андрэевіч, якім для вас быў мінулы год і як для дэкана тэатральнага факультэта БДАМ і вядучага майстра сцэны Тэатра-студыі кінаакцёра пры кінастудыі «Беларусьфільм», і як для мужа, бацькі, дзядулі і прадзядулі?

— Спачатку хачу падзякаваць вам і рэдакцыі газеты «Звязда» за ўвагу да маёй персоны! Мінулы год? Вы ведаеце, тры рэчы ў нашым жыцці ніколі не вяртаюцца: выпушчаная страла, сказанае слова і пражытыя гады. Наша жыццё — не тыя дні тыдня, месяцы, што мы пражылі, а тыя, што запомніліся. Як для дэкана тэатральнага факультэта, або «бацькі вялікай сям'і», як мяне называюць, гэта быў год плённы ў навучальным, творчым, пазнавальным і духоўным плане, нягледзячы на пандэмічныя ды іншыя катаклізмы. Няхай у рэжыме анлайн, але мы працягнулі ўдасканальваць нашы міжнародныя сувязі з тэатральнымі школамі Расіі, Малдовы, Украіны. Набор новых абітурыентаў і выпуск маладых спецыялістаў прайшлі на высокім узроўні пры стапрацэнтным размеркаванні. Гэта дастаткова важныя дзяржаўныя справы. Што датычыцца майго творчага жыцця і дзейнасці ў Тэатры-студыі кінаакцёра, таксама хацелася б выказаць падзяку кіраўніцтву тэатра за магчымасць творча рэалізоўваць сябе, дырэктару Але Сцебаковай і, вядома ж, мастацкаму кіраўніку тэатра народнаму артысту Беларусі Аляксандру Яфрэмаву, калектыву тэатра.

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

Усё магчыма!

«ЦЯЖАРНАСЦЬ 40+ НЕ ДЫЯГНАЗ. ГЭТА ДАР»

Падчас падрыхтоўкі матэрыялу я задала пытанні жанчынам, якія нарадзілі пасля 40. Іх гісторыі вельмі рознымі. Але аб'ядноўвае ўсіх вялізнае жаданне стаць мамай. Другі, трэці, чацвёрты раз... А для кагосьці нават і ўпершыню. У гэтых гісторыях столькі светлай радасці і болю, што пасля размовы хацелася абняць кожную гераіню. Іх прыклады паказваюць, што ўсё магчыма. Галоўнае — верыць і ісці насустрач сваёй мэце. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, ні адна з жанчын не шкадуе ні аб чым. І, калі б была магчымасць вярнуцца назад, яны, не раздумваючы, прайшлі б свой шлях яшчэ раз.

Замуж выйшла позна, нараджаць баялася...

— Вы планавалі позняе дзіця?

Ала, нарадзіла трэцяе дзіця ў 42 гады: Свайго Ціму я ўжо хацела ў 35. Але муж сказаў: «Ведаеш, я яшчэ не выспаўся (у нас старэйшыя дзеці — пагодкі). Давай завядзём любую хатнюю жывёлу, якую хочаш. Я не стала настойваць. Муж у мяне кантралёр у гэтым плане, таму, калі нават і хацела б зацяжарыць, гэта было нерэальна. У 40 гадоў я для сябе тэму родаў закрыла. Падумала: куды ўжо мне нараджаць, дзеці дарослыя. І адпусціла гэтую гісторыю. Калі муж вярнуўся дадому пасля працяглай камандзіроўкі, сказала яму: «Можаш не хвалявацца, з маім дыягназам (мне паставілі эндаметрыёз) не зацяжарыць». Тым самым прытупіла яго пільнасць. Напэўна, мой хлопчык чакаў гэтага моманту. Бо зацяжарыла я адразу.

(Заканчэнне на 6-й стар. «СГ».)

Размова пра галоўнае

КАБ ЛЮБІЦЬ, ТРЭБА ВЕДАЦЬ

У Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы імя Мікалая Астроўскага ў Мінску прайшоў круглы стол на тэму «Ведай і любі сваю Радзіму», падчас якога супрацоўнікі бібліятэк, педагогі, пісьменнікі і прадстаўнікі беларускіх выдавецтваў абмяркоўвалі шляхі выхавання патрыятызму ў дзяцей і моладзі.

Старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхаіл ПАЗНЯКОЎ адзначыў ролю сям'і, школы і дзіцячых бібліятэк з якснай літаратурай у выхаванні дзяцей. Пісьменнік прапанаваў у кожнай бібліятэцы адкрыць кабінеты пісьменнікаў, каб дзеці мелі магчымасць размаўляць з аўтарамі кніг і абмяркоўваць з імі любыя тэмы, якія іх хвалююць. На думку Міхаіла Пазнякова жывыя гутаркі дапамогуць юнаму пакаленню ўсвядоміць важнасць любові да Радзімы і каштоўнасць міру ў грамадстве.

Намеснік дэкана па выхавацкай рабоце факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Ірына БУТОРЫНА прэзентавала ўдзельнікам круглага стала праект «Ад культуры чытання да культуры асобы», скіраваны на тое, каб выклікаць цікаўнасць у моладзі да літаратурнай спадчыны.

Праект працуе ўжо пяць гадоў, за гэты час было праведзена каля 120 урокаў, асноваі якіх стала дзіцячая беларуская літаратура і сусветная дзіцячая казка. Праект карысны не толькі дзецям, але і студэнтам, якія рыхтуюць пазнавальныя мерапрыемствы для малых. Такім чынам будучыя педагогі ўсведамляюць важнасць і ацэньваюць прывабнасць сваёй будучай прафесіі.

Загадчыца сталічнай дзіцячай бібліятэкі № 16 Вольга ЦІТКОВА падзялілася сакрэтамі індывідуальнай работы з маленькімі чытачамі. Яна расказала, як супрацоўнікі бібліятэкі з дапамогай даступных падарункаў (часопісаў і налепак) заахвочваюць маленькіх наведвальнікаў удзельнічаць у конкурсах ды віктарынах.

— Вельмі важна падтрымліваць цікавасць малых да беларускай мовы, — лічыць бібліятэкар. — Часцей прэзентаваць кнігі айчынных аўтараў і ўдзяляць асаблівую ўвагу тэме Вялікай Айчыннай вайны.

Намеснік дырэктара выдавецтва «Беларусь» Вольга ВАНІНА расказала ўдзельнікам мерапрыемства пра новыя кнігі выдавецтва, якія знаёмяць з дасягненнямі суайчыннікаў у розных сферах дзейнасці — ад мастацтва да спорту.

— Нашы выданні — краязнаўчыя, гістарычныя, біяграфічныя, мастацкія і навукова-папулярныя — маюць мэтай выклікаць у дзяцей і моладзі гонар за свой народ і дзяржаву, спрыяюць таму, каб палюбіць месца, дзе нарадзіўся і жывеш, — сказала Вольга Ваніна.

Удзельнікі круглага стала мелі магчымасць пазнаёміцца з кніжнай выставай «Мая радзіма — Беларусь», якую арганізавалі супрацоўнікі Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі. Тут былі прадстаўлены выданні, якія карыстаюцца папулярнасцю ў маленькіх чытачоў.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Ажаніцца — не журыцца

СЯМ'Я НАРАДЖАЕЦЦА Ў ПАЛАЦЫ...

Жывая музыка, нацыянальны ўбор і сентыментальныя слёзы

Адзіны ў краіне палац, у якім можна ажаніцца, знаходзіцца ў сталіцы. У мінулым цяперашні Палац грамадзянскіх абрадаў ведалі як Дом шлюбу, і гэта было адзінае месца, каб ажаніцца з іншаземцам. Магчыма, таму дагэтуль у кожнай чацвёртай створанай тут сям'і адзін з сужэнцаў — жыхар замежжа, а 100 % рэгістрацый летась былі ўрачыстыя. За дзень у сезон мужамі і жонкамі ў палацы становяцца да 20 пар. Што змянілася пасля перайменавання яго ў 2020-м і што тут рыхтуюць для нявест і жаніхоў у 2022-м, расказала кіраўнік установы.

Выязная рэгістрацыя і заказны квартэт

Асноўная функцыя будынка з моманту яго з'яўлення ў 1965 годзе не змянілася — рэгістрацыя шлюбаў, стварэнне ўрачыстай атмасферы, развіццё сямейных каштоўнасцяў. Падтрымкай беларускіх традыцый і папулярызацыяй сям'і тут займаюцца і цяпер, аднак стараюцца шукаць і новыя формы, каб гэты дзень для маладых стаў незабыўным, гаворыць **дырэктар Палаца грамадзянскіх абрадаў галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінгарвыканкама Юлія КОЧЫНА:**

— У кожнай краіне свая заканадаўчая база, пералік пэўных дакументаў, свае ўмовы прыняцця шлюбу, таму наша работа нестандартная, а кожны шлюб з удзелам іншаземца — унікальная з'ява. Усе дакументы разглядаюцца індывідуальна, бо няма нейкага адзінага правіла, каб паўсюдна пэўная афіцыйная папера называлася аднолькава. Наша задача — даць прававую ацэнку дакументам, таму ў ЗАГСах усе спецыялісты маюць юрыдычную адукацыю. Аднак у нас «стасункі» з дакументамі цікавыя, мы нават жартуем, што ў ЗАГСах найлепшая юрыдычная праца для жанчын.

Акрамя таго, што сам палац вельмі прыгожы і ў ім хапае месца, каб запрасіць мноства гасцей, тут яшчэ прапануюць і цікавае ўрачыстае суправаджэнне цырымоніі. У зале рэгістрацыі гучыць жывая фартэпіянная музыка, а пры жаданні можна заказаць цэлы квартэт. Дарэчы, паслуга выезду рэгістратара да месца правядзення ўрачыстасці карыстаецца такім вялікім попытам, што палац проста не можа задаволіць патрэбы ўсіх ахвотных. Летам выязную рэгістрацыю просіць кожная пятая пара, удакладняе дырэктар:

— Мы можам правесці цырымонію ў межах Мінска з выездам у любы рэстаран ці аграсядзібу, а таксама на месца знаходжання гісторыка-культурнага помніка. Аднак для рэгістрацыі ў апошнім маладыя павінны атрымаць дазвол у Мінгарвыканкаме. Паўсюдна, куды нас запрашаюць на выязную рэгістрацыю, месца прыгожа афармлена: ці гэта ў якім-небудзь парку ці каля музея ВАВ.

Паспець за тры дні

Запісацца на рэгістрацыю шлюбу ў палацы можна праз інтэрнэт на сайце Мінгарвыканкама, прычым дзень і час цырымоніі магчыма браніраваць максімум за год наперад.

— Згодна з законам, заява прымаецца не раней чым за тры месяцы і не пазней чым за тры дні да рэгістрацыі. Тым жа, хто заказвае час у нас на сайце, дату падачы заявы за тры месяцы да ўрачыстага дня прызначае камп'ютар, — удакладніла Юлія Кочына. — Гэта вельмі зручна, бо няма чэргаў, людзі самі выбіраюць час. Усе даты настолькі шчыльна распісаны, што знайсці нейкі пазаўрочны час у абыход тых, хто афіцыйна запісаўся, проста немагчыма. Адзінае — мы часам не зачыняемся на абед, каб зарэгістраваць людзей, у якіх ёсць уважлівыя абставіны для заўчаснага роспісу.

Запісацца на рэгістрацыю шлюбу ў палацы можна праз інтэрнэт на сайце Мінгарвыканкама, прычым дзень і час цырымоніі магчыма браніраваць максімум за год наперад.

Рэгіструюць шлюбы ў палацы з чацвярга да суботы. Выхадныя — нядзеля і панядзелак. Хоць бывае, што на нядзелю, калі тут выхадны, прыпадае прыгожая дата, і супрацоўнікі выходзяць на работу. Ужо вядома, што выключэнне зробяць і 22 лютага (22.02.2022). Гэта дата-паліндром (чытаецца аднолькава з абодвух бакоў), у якую, хоць гэта і аўторак, пары будуць таксама распісваць. Запатрабаваныя сёлета даты 22.01.2022 і 22.07.2022. Ну а самы гарачы вясельны час — з чэрвеня да кастрычніка.

Родная мова і рэгістратар у народным строі

Раней, згодна са статыстыкай, кожная чацвёртая-пятая пара ў палацы выказвала жаданне, каб яе рэгістравалі на беларускай мове. Маладыя прыходзілі ў народных строях, родныя праводзілі абрад з ручніком і іншымі атрыбутамі даўнейшага вяселля, адзначае дырэктар установы. Такі падыход падштурхнуў да нацыянальнага крэатыву і супрацоўнікаў.

— З канца мінулага года мы крыху перабудавалі наш падыход да работы. Амаль кожную рэгістрацыю (калі гэта грамадзяне Беларусі), мы праводзім на абедзвюх дзяржаўных мовах краіны. Асноўны тэкст (калі не заказаны беларускі варыянт) цырымоніі адбываецца на рускай мове, а пажаданні ў канцы абавязкова гучаць па-беларуску. Да беларускай мовы абавязкова падбіраецца і айчынная музыка.

З часам дадатковым атрыбутам запатрабаванай вясельнай цырымоніі можа стаць і апрануты ў народны строй рэгістратар. Касцюмы спецыялісты, дарэчы, ствараюць самі, як кажуць, на голым энтузіязме.

Да свята роднай мовы (21 лютага), прынамсі, спецыялісты плануюць выбраць пэўны дзень, каб выйсці на работу ў нацыянальных касцюмах і праводзіць рэгістрацыі выключна на беларускай мове.

Шлюбная геаграфія

Шлюбы ў Беларусі працягваюць сталець. 18-19-гадовыя нявесты і жаніхі, у якіх нават цяжка на вока вызначыць, ці паўналетнія яны, — адзінкавыя выпадкі. Першы раз сям'ю ствараюць цяпер бліжэй да 30, калі ўжо прыходзіць дарослае ўсведамленне рэчаіснасці, заўважыла Юлія Кочына. Аднак гэта не ратуе ад разводаў, якіх у краіне таксама шмат. Летась ледзьве ці не кожная другая пара разышлася, што, магчыма, звязана з пандэміяй.

Разам з тым іншаземцы, якія найчасцей на адзін-два дзясяткі гадоў старэйшыя за нявесту, працягваюць прыязджаць па беларусак. Кожная чацвёртая пара ўжо на працягу гадоў дзесяці ствараецца з замежнікам, і летась у палацы заключылі больш за 200 такіх саюзаў.

— Геаграфія сужэнцаў вельмі шырокая. Класіка — гэта Расія і Украіна. Мноства жаніхоў прыязджае з Турцыі, шмат было прадстаўнікоў Туркменістана, Амерыкі, Італіі, Германіі. У спісе таксама Ізраіль, Вялікабрытанія, Літва, Латвія, Польшча, Францыя, Ліван, Ірак. Сустракаецца і такая экзотыка, як Гамбія, В'етнам, Эквадор, Чылі, — падзялілася дырэктар палаца. — Хоць у асноўным замежнікі-мужчыны прыязджаюць па беларусак, але было і некалькі нявест з Расіі і Украіны, парачка з Амерыкі і па адной — з Ізраіля і Самалі. У большасці выпадкаў усе пары з замежнікамі потым выязджаюць з Беларусі, але здараецца, што некаторыя праз гады вяртаюцца, каб жаніх атрымаў від на жыхарства. Мы заўжды папярэджваем усіх, што ў некаторых краінах наш шлюб не прызнаецца, напрыклад, у той жа Сірыі (там прызнаюцца рэлігійныя шлюбы). І раім браць з сабой дакументы, бо, калі жанчына туды прыедзе, то акажацца бяспраўнай.

«Па статыстыцы, калі ў пары абодва беларусы, іх узрост амаль аднолькавы. За «прынцаў з Усходу» найчасцей выходзяць нашы 20-гадовыя дзяўчынкі, а нявесты, якім пад 30, аддаюць перавагу інтэрнацыянальным шлюбам з еўрапейцамі».

Вельмі запатрабаваныя і ўрачыстыя цырымоніі, на якіх адзначаюцца сярэбраныя (25 гадоў), залатыя (50) і брыльянтавыя (60) юбілеі.

— Асабліва трапяткія мерапрыемствы — брыльянтавыя вяселлі. Яшчэ ніводнае не абышлося без слёз. Нашы супрацоўнікі да такіх рэгістрацый рыхтуюць асаблівую прамову, дзе ва ўрачыстыя словы ўплецены падзеі з жыцця маладых. Іх кароткую біяграфію даведваюць нам сваякі, — падзялілася Юлія Кочына.

Межаў для шлюбнага ўзросту (за выключэннем непаўналетніх) няма. Прыходзяць жаніцца і ў 50, і ў 60, і нават 80-гадовы жаніх летась у палацы быў. Хтосьці ўсё жыццё разам пражыў і прыйшоў, нарэшце, афарміць шлюб, каб прасцей потым было вырашаць пытанні спадчыны, а хтосьці сустрэў сваю палавінку толькі на пенсіі. Супрацоўнікі перакананы, што жаніцца сюды прыходзяць у большасці тыя людзі, якія хочуць атрымаць урачыстае свята. А тут і палац прыгожы, і прырода вакол маляўнічая, і само месца, кажуць, намоленае.

Ірына СІДАРОК.

Эмілія КАЛАМІЕЦ:

«УСЁ Ў ЖЫЦЦІ ДАЕЦЦА НЯПРОСТА»

Пра работу, прызванне, узрост, захапленні, выпрабаванні і дапамогу вышэйшых сіл гутарым з генеральным дырэктарам Дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання «Хімічны сінтэз і біятэхналогіі» — дырэктарам Інстытута мікрабіялогіі, доктарам біялагічных навук, акадэмікам НАН Беларусі Эміліяй Каламіец.

Стварыць, укараніць, прадаць

— Эмілія Іванаўна, за 17 гадоў вашага кіраўніцтва Інстытут мікрабіялогіі неаднойчы аказваўся ў ліку найлепшых у Акадэміі навук, трапляў на Рэспубліканскую дошку гонару. Што было самым цяжкім для вас за гэтыя гады?

— Усё давалася няпроста. Мяне прызначылі дырэктарам у 55 гадоў. Сіл і энергіі яшчэ было дастаткова, але вопыту арганізацыйнай дзейнасці не хапала. Як дабіцца таго, каб супрацоўнікі жылі нябедна? У якім напрамку, за кошт чаго развіваць інстытут? На гэтыя пытанні даводзілася шукаць адказ. Каштоўныя распрацоўкі ў калектыве меліся. Але ў краіне адсутнічалі прафільныя высокатэхналагічныя прадпрыемствы для асваення вытворчасці інавацыйнай прадукцыі. Стварылі свае магутнасці: у 2009 годзе адкрылі біятэхналагічны цэнтр, аснашчаны сучасным абсталяваннем, і пачалі выпускаць вопытныя партыі біяпрэпаратаў для фарміравання спажывецкага попыту. Аднымі з першых у НАН Беларусі ініцыявалі ДНТП «Прамысловыя біятэхналогіі». Гэта праграма дазволіла прыцягнуць спецыялістаў іншых арганізацый, каб аб'ектыўна ацэньваць нашы прэпараты і тэхналогіі, перспектыўнасць іх прымянення ў сельскай гаспадарцы, медыцыне, ахове навакольнага асяроддзя. Так мы здзейснілі сапраўдны прарыў на шляху камерцыялізацыі інтэлектуальнага прадукту.

«Нікому не зайздрошчу. У мяне вельмі развіта пачуццё свайго лёсу, свайго шляху, шчасця, крыжа».

— Сёння ўжо няма праблем з пошукам сродкаў на развіццё навукі?

— Важная крыніца фінансавання навукова-тэхнічнай дзейнасці інстытута — дзяржпраграмы рознага ўзроўню. Сама іх распрацоўка — велізарная інтэлектуальная работа. Кажу гэта як аўтар, у тым ліку міждзяржаўнай мэтавай праграмы ЕўрАзЭС «Інавацыйныя біятэхналогіі». Вынікам рэалізацыі праграм стала стварэнне больш як 60 біятэхналогій, практычнае выкарыстанне якіх таксама прыносіць даход. Арганізацыя ДНВА «Хімічны сінтэз і біятэхналогіі» дазволіла мабілізаваць намаганні розных акадэмічных структур і вырашаць шэраг складаных задач, з якімі не па сілах справіцца інстытуту. Так, у супрацоўніцтве з Бабруйскім заводам біятэхналогій намі паспяхова выкананы, напрыклад, буйны заказ расійскай кампаніі на распрацоўку і вытворчасць полікампанентнага прэпарату для раслінаводства.

— Колькі часу патрабуецца на распрацоўку арыгінальнага прэпарату?

— Гады тры. Гэты тэрмін звязаны з неабходнасцю правядзення двухгадовых рэгістрацыйных іспытаў. Звычайна супрацоўнікі лабараторый адначасова працуюць над 5—6 праектамі. Сёння шмат працуем над павышэннем канкурэнтаздольнасці, удасканаленнем прэпаратаў і тэхналогій, каб яны і заўтра заставаліся запатрабаваны на рынку.

Навука любіць апантаных

— Якія якасці дапамагаюць стаць паспяховым кіраўніком, дасягаць высокіх вынікаў?

— Сёння ўсё часцей чуеш, што вучоны павінен быць менеджарам. Але, зыходзячы са свайго досведу, магу сцвярджаць: чалавек, які не валодае спецыфікай нашай работы, наўрад ці здолее правільна размеркаваць чалавечыя і фінансавыя рэсурсы, дакладна вызначыць далягляд і спосабы дасягнення мэты. Мяне раставала якраз тое, што, прасоўваючыся па службовай лесвіцы, прыступка за прыступкай, я ведала ўсю «кухню» інстытута знутры. Сваім плюсам як кіраўніка лічу гатоўнасць вучыцца. Ніколі не саромеюся кансультавацца ў калег, пераймаць іх досвед. Што да арганізатарскіх здольнасцяў, па ўсёй верагоднасці, яны закладваюцца на генетычным узроўні. З глыбокага дзяцінства памятаю маміны словы: «Там, дзе ты з'яўляешся, усё становіцца на свае месцы».

— Вы патрабавальны кіраўнік?

— Магу часам рэзка выказацца, калі назіраю адсутнасць ініцыятывы, недастатковую актыўнасць у падрыхтоўцы кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Але я люблю сваіх супрацоўнікаў, шаную калектыў. Імкнуся падтрымліваць здаровую атмасферу, каб на работу ў інстытут хацелася ісці.

— Ці адчуваеце праблему прытоку маладых кадраў?

— Не. Каля 60 % нашых супрацоўнікаў — моладзь. І гэта вытлумачальна. У інстытуце ёсць цікавыя праекты, сучаснае абсталяванне, перспектывы службовага росту і магчымасць добра зарабляць.

— Ці ёсць нейкія маркёры, па якіх адразу зразумела, хто з маладых супрацоўнікаў стане таленавітым даследчыкам, затрымаецца ў навуцы, а хто — не?

— Звычайна гэта відаць ужо па першых справаздачах, па тым, як чалавек трактуе лічбы, паказчыкі, вынікі даследаванняў, ці ўмее аналізаваць, бачыць за прыватным тэндэнцыі, выбудоўваць асобныя факты ў сістэму. Сапраўдны вучоны заўсёды прагны да працы, дапытлівы. Выканаўшы эксперымент, ён не будзе сядзець без справы, а знойдзе ўсю інфармацыю па гэтым пытанні, параўнае з вопытам калег. Калі бачу адсутнасць цікавасці да даследаванняў, заўсёды раю: «Не губляйце часу дарма, шукайце сябе ў іншых сферах». Хоць шмат што залежыць і ад кіраўнікоў: часам маладым трэба дапамагчы раскрыць у сабе патэнцыял вучонага.

— Адміністрацыйная работа зусім не пакідае вам часу і сіл для навукі?

— Яна шмат іх адымае. Але я курырую ўсе праекты. Чытаю ў вольны час дысертацыі, падказваю ідэі. У маладосці часта марнуеш час і сілы нерацыянальна. А з узростам вучышся аддзяляць галоўнае ад другаднага, працаваць больш прадукцыйна. Я і калег вучу не распыляцца, а засяродзіцца і ісці да мэты самым кароткім шляхам.

«Сваім плюсам як кіраўніка лічу гатоўнасць вучыцца. Ніколі не саромеюся кансультавацца ў калег, пераймаць іх досвед».

— Спытаю вас як вучонага: які ўзрост аптымальны для выхаду на пенсію?

— Усё, па-мойму, вельмі індывідуальна: у кожнага свой патэнцыял сіл, здароўя, жаданняў. Вось акадэмік Пётр Аляксандравіч Віцязь у свае 85 гадоў пасля камандзіроўкі на Далёкі Усход на наступную раніцу выходзіць на работу. А ёсць людзі, якія ў 50 марыць аб пенсіі. У балеце ідуць на заслужаны адпачынак яшчэ раней. Навукоўцам, на мой погляд, трэба працаваць, пакуль яны могуць прадуцыраваць ідэі, адчуваюць жаданне і цікавасць да спазнання. Асабіста я ўсім дасведчаным, закаханым у навуку калегам-пенсіянерам падаўжаю кантракты.

— Вы гадуеце сабе пераемніка?

— Вядома. Ужо сёння гатова саступіць крэсла і вярнуцца ў свой аддзел, курыраваць аспірантаў. Але пакуль усе мае патэнцыйныя пераемнікі настолькі захоплены навукай, што адмаўляюцца ад адміністрацыйнай работы. Я ж хачу перадаць інстытут у надзейныя рукі кагосьці са сваіх калег. Калі ў такім калектыве, як наш, з'яўляецца кіраўнік збоку, вялікая рызыка страціць створанае за гады.

Тэрыторыя любові, веры і надзеі

— У перыяд перабудовы многія навукоўцы вымушана пакідалі навуку. Вас не наведвалі такія ж думкі?

— Не. Калі разваліўся СССР, сітуацыя, сапраўды, аказалася вельмі складанай. Пры заробку ў 20 долараў ездзіла з мужам гандляваць у Польшчу, каб карміць сям'ю. За выхадныя магла атрымаць 300—400 долараў, але не лічыла бізнес сваім пакліканнем, мне хацелася застацца ў навуцы.

— Ці ёсць у вашай сям'і яшчэ навукоўцы?

— Не. Мой муж — інжынер-механік. Цяпер ужо на пенсіі. Дачка Ганна, гледзячы на мой лад жыцця, цвёрда сказала: у навуку нізавошта не пайду. Скончыла БДТУ, зараз вядучы інжынер у буйной кампаніі. Сын Вячаслаў не працуе, у яго інваліднасць. Унучка Марыя — эканаміст у лізінгавай кампаніі. Ёсць у мяне і праўнук Мікалай: ён — наша ўцеха.

— Блізкія вызвалялі вас ад бытавых клопатаў, улічваючы нагрузку на рабоце?

— Практычна не. Як усе жанчыны, і гатавала, і мыла, і дзецьмі займалася. Сын у дзяцінстве патрабаваў шмат сіл і ўвагі, выцягвалі яго разам з мужам як маглі. Гэта стала вялікай школай, я шмат чаго ў жыцці ўсвядоміла, пераасэнсавала. Доктарскую дысертацыю тады прыйшлося адкласці. Але я ўсё ж абараніла яе, няхай і праз 20 гадоў пасля кандыдацкай. Калі ў бацькоў пачаліся праблемы са здароўем, клопат аб іх лёг у асноўным на мае плечы. Прызначэнне на пасаду дырэктара інстытута супала з пагаршэннем іх стану. Уставала ў пяць раніцы, каб усё паспець. І не магу сказаць, што ўспрымала гэта як цяжар, ад якога толькі і чакаеш, як бы хутчэй пазбавіцца. Ёсць рэчы, якія прымаеш, бо не можаш іх змяніць.

«Сапраўдны вучоны заўсёды прагны да працы, дапытлівы. Выканаўшы эксперымент, ён не будзе сядзець без справы, а знойдзе ўсю інфармацыю па гэтым пытанні, параўнае з вопытам калег».

— Вы хоць бы зрэдку адчуваеце зайздрасць? У дачыненні да каго ці чаго такое здараецца?

— Нікому не зайздрошчу. У мяне вельмі развіта пачуццё свайго лёсу, свайго шляху, шчасця, крыжа. Памятаю, аднойчы экстрасэнс сказаў мне: «У вас настолькі магутная і цэласная энергетычная абалонка, што да вас нічога дрэннага не прыстае». І я ў гэта веру.

— Ці ёсць у вас хобі?

— Па маладосці вельмі любіла спорт. І пробежкі рэгулярна здзяйсняла, і ёгай займалася. Цяпер стараюся проста больш рухацца, хадзіць пешшу. А яшчэ ўвесь час нешта будую, рамантую, пераабсталёўваю. І ў інстытуце, і па-за ім. На дачы пераважна даглядаю кветкі. У Мінску таксама жывём у прыватным доме з невялікім участкам. Яго добраўпарадкаванне для мяне — сапраўдная творчасць.

— Чула, што вы прыхаджанка аднаго з каталіцкіх касцёлаў Мінска. Як сумяшчаюцца навуковыя веды з верай?

— Можа, вас здзівіць, але для мяне ў гэтым няма супярэчнасці. Многія навукоўцы прыходзяць да веры. Памятаю словы адной манахіні. «Глыбока верыць той чалавек, які на сабе адчуў любоў Бога». Я з дзяцінства адчуваю гэтую любоў. Часам кладуся спаць, і да мяне ў сне прыходзяць адказы на пытанні, якія мучылі. Нечакана атрымліваю дапамогу, праблемы цудам вырашаюцца. Як пасля гэтага не верыць у Бога?

Вольга ПАКЛОНСКАЯ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.



«Марым аб брыльянтавым

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

У мяне ў рэпертуары на сёння 10 назваў розных спектакляў, і практычна ў кожным галоўныя ролі. Гэта «Пігмаліён», «Хто смяецца апошнім», «Механічны чалавек», «Безыменная зорка», «На ўсякага мудраца даволі прастаты», «Забыцца Герастрата», «Фальшывая нота» і іншыя. У Акадэміі мастацтваў, дзе я працую ўжо 35 гадоў, мяне называюць «трэнер, які іграе». Я чалавек несупакоены. Мусіць, таму так доўга жыву... Яшчэ не ўсё паспеў, не ўсё зрабіў... Хоць зроблена нямала, сыграна больш за сотню роляў у тэатры, кіно, на тэлебачанні і радыё. Скажу шчыра, для мяне наша Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў і Тэатр-студыя кіна-акцёра непадзельныя, гэта мой другі дом. Тэатру служу больш за 55 гадоў. Ніколі яму не здраджваў і не здраджу, пакуль буду жыць! Для акцёра галоўнае — быць запатрабаваным. Я ўдзячны Богу і лёсу за гэты бясцэнны падарунак!

«Людзі пазнавалі і пазнаюць мяне на вуліцы, у метро, трамваі і дзякуюць за тое, што гэтыя карціны адкрылі для нас новыя факты пра вайну, кажуць, што іх можна паказваць на ўроках гісторыі».

— Вы нарадзіліся ў простай сялянскай шматдзетнай сям'і на Палессі. А якая ў вас сям'я цяпер?

— Так, маё дзяцінства прайшло ў Драгічынскім раёне ў вёсцы Валавель. Нас было шасцёра. Мама і тата, простыя малаадукаваныя сяляне, рабілі ўсё, каб мы выраслі найперш людзьмі. Тата прайшоў вайну, ваяваў пад камандаваннем Канстанціна Ракасоўскага, потым Георгія Жукава, пасля вайны быў конюхам у калгасе. Ніколі не забуду, як вучыў нас з братам Мікалаем касіць, заграбаць сена, араць зямлю, капаць торф, ездзіць вярхом на конях. Аднойчы ён сказаў: «Хлопцы мае, хачу, каб па гэтым жыцці вы да сваёй мэты ехалі на трох конях, якіх клічуць Сумленне, Міласэрнасць і Сорам!» Гэтага пастулата прытрымліваюся ўсё сваё жыццё. І яшчэ памятаю, як мама пашыла мне торбачку цераз плячо для школьных сшыткаў і буквара, калі я ішоў у першы клас... Каб не разгубіў сшыткі, каб сумачка не раскрывалася, яна папрасіла ў таты гузік ад шыняля, які вісеў у сенцах хаты, якім на зіму мама накрывала дзежы з салам, саленнямі. І прышыла яго да гэтай сумкі. Калі я ішоў па вуліцы, мне здавалася, што

Уладзімір МІШЧАНЧУК.

ўсе людзі глядзяць на гэты «залаты» гузік з зоркай. Яна асвятляе мой жыццёвы шлях да сённяшняга дня.

Мая сям'я таксама не маленькая. У нас з маёй жонкай Людмілай Кучарэнкай двое дзяцей: Андрэй і Кацярына, двое ўнукаў і двое праўнукаў, але яшчэ, як кажуць, не вечар. Калі нам было на дваіх 100 гадоў, мы абвянчаліся ў царкве. Мы Львы, нарадзіліся 3 і 5 жніўня ў адзін год — 1946-ы.

Дзецям сваім мы далі вышэйшую адукацыю. Сын Андрэй скончыў нашу Акадэмію мастацтваў, мае спецыяльнасць «Рэжысёр тэлебачання». У яго зараз свой бізнес, ён ужо дзядуля, а мы, адпаведна, сталі прадзедам і прабабуляй.

Дачка Кацярына пачала вучыцца музыцы тут, у каледжы пры Акадэміі музыкі, але потым яе запрасілі ў школу пры Маскоўскай кансерваторыі па класе скрыпкі. Там жа яна атрымала вышэйшую музычную адукацыю, працавала ў Вівальдзі-аркестры пад кіраўніцтвам народнай артысткі Расіі Святланы Бязроднай, потым прайшла конкурс у аркестр «Новая Расія» пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Юрыя Башмета. Аб'ездзіла ўвесь свет, зараз воляй лёсу вярнулася дадому, у Мінск, працуе ў Дзяржаўным камерным аркестры Беларусі, займаецца педагагічнай дзейнасцю, выхоўвае сына. Нікан пайшоў па мамінай сцежцы. Ужо, як і маці, лаўрэат міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў, пераможца Рэспубліканскага тэлевізійнага конкурсу «Талент краіны», нядаўна стаў лаўрэатам Дэльфійскіх гульняў, якія праходзілі ў Маскве. Ганаруся тым, што ён іграе са мной у тэатры ў спектаклі па п'есе французскага драматурга Дзідзье Карона «Фальшывая нота», дзе з намі на адной сцэне мой вучань, выдатны акцёр Сяргей Лапаніцын. Памятны мінулы год будзе тым, што на VI Рэспубліканскім тэатральным конкурсе «Нацыянальная тэатральная прэмія» гэтая пастаноўка перамагла ў намінацыі «Найлепшы спектакль для вялікай сцэны», а я асабіста ўдастоены дыплома «За найлепшую мужчынскую ролю». Гэтую прэмію я называю беларускі Оскар! На XIX Міжнародным тэатральным форуме ў Маскве «Залаты Віцязь» гэты ж спектакль атрымаў найвышэйшую ўзнагароду Міжнароднага журы — «Залаты дыплом» у намінацыі «За найлепшы акцёрскі дуэт».

«Сям'я ў маім разуменні — вялікая будаўнічая пляцоўка, дзе ёсць свае архітэктары, інжынеры, будаўнікі і проста працоўныя».

— Мы далучаемся да віншаванняў і рады гэтай высокай адзнацы вашай творчасці! Але зноў хачу вярнуцца да спраў сямейных.

— Сям'я ў маім разуменні — вялікая будаўнічая пляцоўка, дзе ёсць свае архітэктары, інжынеры, будаўнікі і проста працоўныя. Хто і як тут выконвае сваю ролю, залежыць ад абставін, умоў і магчымасцяў. Кожны чалавек — гаспадар свайго лёсу... Мы з Людмілай будуем нашу сям'ю да сённяшняга дня вось ужо 52 гады, у сакавіку 2022 года будзе 53! Марым аб брыльянтавым вяселлі... Жартую!

— Сябры і знаёмыя называюць вашу сям'ю італьянскай. Чаму?

— Мусіць, таму, што сярод творчых сем'яў жыць і тварыць столькі гадоў — рэдкасць і таму, што мы эмацыянальныя, не супакоеныя. Разам працуем у акадэміі, выпусцілі не адзін курс у нашай творчай майстэрні. Людміла — цудоўны педагог, дацэнт, шмат здымаецца і здымалася ў кіно, працавала ў тэатры. Многія пытанні вырашаем часам бурна, разводзімся, потым, натуральна, сыходзімся, адыходзім, прызнаючы сваю гарачнасць або памылку. Я не веру, што ёсць сем'і, у якіх усё гладка, усё складна, суцэльная ідылія. Гэта хутчэй паказуха!

«Я не веру, што ёсць сем'і, у якіх усё гладка, усё складна, суцэльная ідылія. Гэта хутчэй паказуха!»

— З Людмілай Пятроўнай вы пазнаёміліся ў 60-я гады тут, у Мінску, потым быў Гродзенскі тэатр, потым вас перавялі на работу ў БДТМІ — цяперашнюю Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў?

— Гэта асаблівая старонка ў нашым жыцці. Я паступаў у тэатральны інстытут двойчы. Першы раз прыехаў паступаць, а іспыты ў ліпені, мне яшчэ не было 16 гадоў. Потым яшчэ раз паступаў, і вось тут, пры чытанні загада аб залічэнні я, як кажуць, нос у нос сутыкнуўся з Людмілай каля дошкі аб'яў, дзе і ўбачылі свае прозвішчы. Вось тут адбыўся вокамгненны разрад, мы кінуліся адзін да аднаго, крычалі, абдымаліся, цалаваліся, лаяліся нецэнзурнымі словамі... І вось ужо 52 гады гэты вокамгненны разрад рэхам адгукаецца ў нашым паўсядзённым жыцці. Студэнцкія гады — гэта сон, казка, пакуты творчасці, пошук сапраўднага я, сумненні і расчараванні, радасць ад першых поспехаў. Усё дзялілі з ёй разам, гора і радасці. Мяне пакідалі працаваць у Мінску ў Тэатры юнага гледача, я ўжо рэпетыраваў там галоўную ролю. Рэжысёр Барыс Ганага сказаў, маўляў, толькі да нас, Барыс Луцэнка з Рускага тэатра імя М. Горкага сказаў тое ж самае. Я ў Барыса Іванавіча іграў у яго спектаклі... У Людмілы таксама быў выбар... Ехаць на Поўнач у ваенны тэатр ці ў Гродзенскі абласны драматычны тэатр. Рэктар адгаварыў яе ад Сібіры, і яна падпісала размеркаванне ў Гродна. Натуральна, я адмовіўся ад размеркавання ў Мінску і папрасіў размеркаваць мяне ў Гродзенскі абласны драматычны тэатр, куды ехалі чатыры нашы выпускнікі і Людміла ў тым ліку. Галоўны рэжысёр Гродзенскага тэатра, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР Аляксандр Пятровіч Струнін сказаў, што ў яго няма больш месцаў. Я маліў: «Вазьміце хоць кім-небудзь!», і ён узяў — рабочым сцэны. Я пагадзіўся і амаль два месяцы быў на гэтай стаўцы, а потым з'явілася магчымасць перайсці ў акцёрскую трупу.

— У Гродна вы, 27-гадовы, былі самым маладым дырэктарам тэатра ў Савецкім Саюзе. Да таго часу ўжо ажаніліся?

— Так. Мы былі вельмі занятыя ў рэпертуары, ігралі шмат роляў практычна кожны вечар. Таму вяселле адгулялі ў адзіны выхадны дзень — панядзелак. Тэатр падарыў нам тахту, таршэр і касетны прыёмнік. Тое, што мы вельмі хацелі! Госці, якія прыйшлі на вяселле, сваякі, знаёмыя таксама былі з падарункамі. Мы адзначалі вяселле ў кафэ «Бярозка», што на вуліцы Горкага ў Гродне, і падарункі складалі ў гардэробе. Пасля вяселля іх не знайшлі. На жаль, а можа, на шчасце.

Людміла КУЧАРЭНКА і Уладзімір МІШЧАНЧУК.

Потым Людміла зацяжарыла, а мяне і майго аднакурсніка Уладзіміра Шмакава забралі на год служыць у войска, у Ордэна Леніна Ленінградскую ваенную акругу ў мястэчка Наваселіцы, што пад Ноўгарадам. Палову года правялі ў вучэбцы, а потым ужо служылі па спецыяльнасці радыст. І яшчэ нас прызначылі ў салдацкі клуб, дзе мы ўзялі самадзейнасць на высокі ўзровень. Успамінаю, што да стагоддзя У. І. Леніна выступалі ў Доме афіцэраў Ленінграда так удала, што нам прапанавалі застацца там служыць з прысваенням лейтэнанцкага звання. Аднак мы з Уладзімірам пасля службы адправіліся ў родны тэатр.

У мяне была і чыста сямейная прычына вярнуцца ў Гродна. Людміла, як дзекабрыстка, прыязджала да мяне ў часць незадоўга да родаў перад Новым годам, а ў студзені з'явіўся наш сын Андрэй!

Мы былі маладымі бацькамі, калі абкам партыі, упраўленне культуры вобласці на агульным сходзе прапанавалі маю кандыдатуру на пасаду дырэктара тэатра. Гэта як гром з яснага неба.... Калектыў тэатра аднагалосна прагаласаваў «за». Адразу ж прынялі кандыдатам у партыю. Усяму прыйшлося вучыцца само-

З унукам у спектаклі «Фальшывая нота».

вяселлі»

му, прапанаваў запрасіць новага галоўнага рэжысёра тэатра. Тады бліскуча працавалі ў Мінску Валерый Раеўскі і Барыс Луцэнка, а ў Магілёве — Уладзімір Караткевіч. На шчасце, Уладзімір Аляксандравіч пагадзіўся. Пачаўся перыяд рэнесансу ў Гродзенскім тэатры: мянялі рэпертуар, работу з гледачом, з моладдзю, удзялілі ўвагу матэрыяльна-тэхнічнай базе і сталі адным з найлепшых абласных тэатраў у БССР. Усе пераходныя Чырвоныя сцягі былі ў нас! Удзячны лёсу за гэтае выпрабаванне! Больш за 15 гадоў прапрацавалі там, паспелі пабудаваць новы будынак тэатра, які з'яўляецца цяпер візітоўкай Гродна, абновілі трупу, гастрольныя маршруты ды шмат іншага.

З дачкой Кацярынай і ўнукам Ніканам.

«Калі чалавек апантаны ідэяй, задачамі, праблемамі, калі ўсё будзе рабіць адказна і з задавальненнем, то паспее зрабіць намечанае»

У Гродне нарадзілася наша дачушка Кацярына. Калі ёй было 11 гадоў, паступіла прапанова пераехаць у Мінск у БДТМІ на пасаду загадчыка кафедры майстэрства акцёра і рэжысуры. Выклікалі мяне некалькі разоў у Міністэрства культуры для перагавораў і ў ЦК Кампартыі БССР для вырашэння гэтага пытання. Усё гэта было няпроста, але ў 1985 годзе мы развіталіся з тэатрам і горадам Гродна і пераехалі ў Мінск.

І зноў усё спачатку. Новыя абавязкі, новыя ўмовы, зноў інтэрнат пасля чатырохпакаёвай кватэры, новыя праблемы, новыя задачы. Удзячны Богу і сваёй жонцы, дзецям, сябрам, якія словам і справай падтрымлівалі і давалі Надзею і Веру. І вось ужо 35 гадоў мы тут! З іх пяць гадоў быў загадчыкам кафедры майстэрства акцёра і рэжысуры, а калі кафедру падзялілі на дзве, мяне абралі дэканам тэатральнага факультэта, дзе служу, дзякуй Богу, па сёння. Бязмерна ўдзячны кіраўніцтву акадэміі, якое было і якое ёсць зараз, асабіста Міхаілу Рыгоравічу Баразне, якія давалі і даюць мне магчымасць творча рэалізаваць сябе ў тэатры, кіно, на радыё і тэлебачанні.

— Уладзімір Андрэевіч, летась вы былі шчыльна занятыя ў новых тэлевізійных праектах, такіх знакавых, як хранікальна-дакументальныя серыялы «Крылы перамогі» і «Партызанскі рубеж». Вы шмат здымаліся ў ігравым кіно. Перыядычна мы бачым вас у расійскіх серыялах, нядаўна прайшлі па розных каналах «Экспрапрыятар», «Тонкі лёд», «У цеснаце, ды не ў крыўдзе», «Безыменная вышыня», «У чэрвені 41-га». Як цяпер справы з тэлеі кіназдымкамі?

— Да згаданых дакументальных серыялаў дадам знятыя на АНТ фільмы «Рана на целе Беларусі» і «Тры дні свабоды». Гэтыя карціны мне дарагія тым, што заснаваны на дакладных звестках, якія доўгі час належалі выключна архівам. Гэта частка нашай гістарычнай праўды пра Вялікую Айчынную вайну, пра нашых лётчыкаў і партызанскі рух у гады ліхалецця. Усе гэтыя работы атрымалі добрую адзнаку гледачоў. Людзі пазнавалі і пазнаюць мяне на вуліцы, у метро, трамваі і дзякуюць за тое, што гэтыя карціны адкрылі для нас новыя факты пра вайну, кажуць, што іх можна паказваць на ўроках гісторыі.

«У нас з маёй жонкай Людмілай Кучарэнкай двое дзяцей: Андрэй і Кацярына, двое ўнукаў і двое праўнукаў, але яшчэ, як кажуць, не вечар».

Што да кіно... Дзякуй, што памятаеце фільмы з маім удзелам, але гэта ўжо гісторыя... Цяпер, на жаль, усё складана. Здымак мала, ды і эпідэміялагічная сітуацыя нагадвае аб сабе. Веру, што ўсё стабілізуецца з часам. Трэба ўмець чакаць. Вяртаючыся да пачатку нашай гутаркі, хачу сказаць, што мінулы год паказаў: кінематограф жывы. У гэтым я пераканаўся, калі праходзіў XXVII Мінскі Міжнародны кінафестываль «Лістапад», дзе я ўпершыню меў гонар прадстаўляць нашу краіну ў Міжнародным журы ігравога кіно побач з Іванай Жыгон (Сербія), Лю Чжунчжэ (Кітай), Рэнатам Даўлецьяравым (Расія) і іншымі. Хачу сказаць, што ўзровень прадстаўленага на фэсце матэрыялу досыць высокі ў плане духоўным, эксперыментальным, мастацка-выразным. Ёсць надзея!

«Удзячны Богу і сваёй жонцы, дзецям, сябрам, якія словам і справай падтрымлівалі і давалі Надзею і Веру».

— Як вы ўсё паспяваеце? Як знаходзіце час для адпачынку?

— Скажу адно: калі чалавек апантаны ідэяй, задачамі, праблемамі, калі ўсё будзе рабіць адказна і з задавальненнем, то паспее зрабіць намечанае. Я яшчэ ўмудраюся пісаць вершы на беларускай і рускай мовах, у вольны час калі-нікалі займаюся мастацкай фатаграфіяй, пішу карціны, выразаю з дрэва, малюю на бяросце.

— Калі ў вас спытаць пра сэнс жыцця...

— Сэнс жыцця бачу ў самаўдасканаленні і, пакуль жывы, веру ў Бога, прытрымліваюся яго запаведзяў. На памылках мы вучымся, на поспехах расцём.

— Ведаю, што вы чытач «Звязды» са стажам. Напярэдадні Новага года па ўсходнім календары што вы пажадалі б нашым чытачам?

— Пажаданне маё — усім здароўя, берагчы тое, што маем, любіць і паважаць адно аднаго, не на пустых словах, а на справе любіць сваю зямлю, сваю малую і вялікую Радзіму, нашу гісторыю, а гісторыя належыць таму, хто ахоўвае і шануе мінулае, хто з вернасцю ды любоўю звяртае свой позірк туды, адкуль ён з'явіўся, дзе ён стаў тым, хто ёсць!

Маргарыта ДРАЗДОВА.
Фота з уласнага архіва героя.

Выпрабавана на сабе

ЗАПЛАЦІЎ ЗА ТОЕ, ШТО МЕЎ

Як знайсці жанчыну для сур'ёзных адносін

Пра сябе: разведзены, жыву адзін, жыхар абласнога цэнтра, каля пяцідзесяці... Маю дзяцей-падлеткаў, якія жывуць з былой жонкай. З ёй адносіны, скажам так, афіцыйна-дзелавыя і, як правіла, праз месенджары. Бачымся толькі тады, калі сустрэча неабходная, каб вырашыць пытанне, якое датычыцца дзяцей. Як у фільме «Пакроўскія вароты»: высокія, высокія адносіны!

Для некаторых — пустая цікаўнасць

Шукаць жанчыну, як прынята ў стагоддзе інтэрнэту, пачаў з адпаведных сайтаў. І хутка зразумеў, што многія з дам там проста бавяць час. Некаторыя самі прызналіся, што не вераць у сур'ёзныя адносіны праз «ціндары». Дзве жанчыны падчас спатканя адразу абазначылі: замуж не хочуць. Знаёмяцца, каб схадзіць у кавярню на каву і кан'як з чарговым прэтэндэнтам на блізкія стасункі. Былі і прызнанні пра пошукі не мужа, але партнёра ў сексе. Дарэчы, вопыт інтэрнэт-знаёмстваў адкрыў для мяне, што не толькі мужчыны бываюць заклапочаны гэтым аспектам жыцця. (Аднойчы пазнаёміўся з бландзінкай, настрой якой непасрэдна залежаў ад таго, ці ёсць ёй з кім сёння правесці ноч.)

Сваха лепш?

У маім горадзе ёсць жанчына, якая займаецца гэтым бізнесам легальна, калі не памыляюся, гадоў з дзесяць. «Інфармацыйныя паслугі» (так абазначана ў бланку на аплату) каштуюць рублёў 25—30. За кожны нумар тэлефона дамы, фота якой мне спадабалася, заплаціў па два рублі. Фота, дарэчы, не на экране манітора, а надрукаваны на паперы. «Кансультант» растлумачыла, што такім чынам яна блакіруе магчымасць скрасці файлы. Я толькі паціснуў плячыма.

Запісаў каля дзесяці нумароў. Тэлефанаваць не рашыўся. Пачаў пісаць па месенджарах: маўляў, хачу пазнаёміцца. Сваха папярэдзіла: абавязкова трэба абазначыць мэту. Палова кантактаў не адказалі. Адна адказала, што не разумее, пра што рэч. У іншай каля года таму дачка нарадзілася,



Малюнак Дар'і КІШКІНОЙ.

З іншагароднімі і тым больш іншаземкамі я адразу спрабаваў канкрэтызаваць: ці згодныя яны развіваць стасункі. Проста перапіска асабіста мне не патрэбна, нават з «гарачымі» фантазіямі. Справа ў тым, што на сайтах знаёмстваў рэгіструюцца ў тым ліку жанчыны, якім падабаецца бачнасць рамана, але болей ім не трэба.

Што і з кім не так?

Пра некалькі знаёмстваў хочацца распавесці асобна. Мінчанка-равеснічка спачатку праявіла, як мне падалося, шчырую цікавасць да магчымасці развіцця адносін. Удава, па адукацыі стаматолаг, але працуе ў масажным салоне. Дзён праз дзесяць прызналася, што... проста праводзіць сацыяльны эксперымент. Маўляў, раней на сайце не была і вырашыла паспрабаваць. Забава такая.

Яшчэ адна стаматолаг, гадоў на 15 маладзейшая, таксама з Мінска, усё спасылалася на тое, што няма часу пагаварыць па тэлефоне. Верыў. У тое, што вельмі стамляецца, што пакуль не гатова пачаць размову, бо хоча лепш зразумець, ці трэба наогул працягваць стасункі. Скончылася тым, што паведаміла пра свой магчымы ад'езд за мяжу. Маўляў, якая розніца: адкуль мы адно аднаму пісаць будзем... Адчуванні, ведаеце, не самыя прыемныя пасля такога «развіцця».

Абаяльная настаўніца англійскай мовы настолькі мне спадабалася, што ўчыніў глупства. Карыстаючыся камандзіроўкай у Мінск, вырашыў сустрэцца. Але не ўзгадніў дату спаткання. У адзін цудоўны дзень прыехаў у сталіцу — яна паведаміла, што толькі вечарам скончыць працу, падмяніць яе няма каму. Але і пасля працы, напэўна, не змагла знайсці час. Або не пажадала, бо нават не патэлефанавала ў той дзень. Было крыўдна, але ўсё роўна спрабаваў рабіць крокі насустрач... А хутка настаўніца знайшла сабе мінчаніна.

Толькі час траціць?

Напэўна, я проста няўдачлівы. Мой сябар гадоў колькі таму праз сайт пазнаёміўся з будучай жонкай, і яны жывуць у каханні. Нядаўна быў у іх у гасцях. Яна прыйшла з вуліцы, а мы сядзелі за сталом на кухні. Абняла яго, пацалавала, хоць не было яе дома пару гадзін.

Дарэчы, я ж яму сам падказаў — жартам — што можна на сайтах знаёміцца. Ён паверыў, і атрымаўся, як кажуць, звычайны цуд.

Калі падсумаваць, то, напэўна, самае першае, што трэба зрабіць, калі рашаешся на знаёмства праз памочнікаў (жывых альбо лічбавых), гэта адказаць шчыра на пытанне: навошта? якая мэта? што ты насамрэч хочаш? на што гатовы? Другая выснова — расчараванні спараджаюць боязь.

Зараз падумваю пра «хуткія спатканні», але не ўпэўнены, што рашуся, бо ўсё ж веру ў каханне з вялікай літары...

Андрэй ПЯТРОЎ.

«ЦЯЖАРНАСЦЬ 40+ НЕ ДЫЯГНАЗ. ГЭТА ДАР»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Таццяна, нарадзіла другое дзіця ў 42 гады: Замуж я выйшла позна, таму першы сын з'явіўся толькі ў 35. Свядома нараджаць другое дзіця баялася. Думала, калі Бог пашле да 43 гадоў, дык нараджу. Так яно і здарылася. Са з'яўленнем другога дзіцяці з'явілася адчуванне поўнай сям'і. Да гэтага мне ўвесь час здавалася, што некага не хапае.

Алена, упершыню стала мамай у 43 гады: Я 22 гады прапрацавала ў школе настаўніцай пачатковых класаў. Заўсёды праца, праца, праца. У раддоме ў мяне пыталіся: «А чаму так позна?» Таму што чакала... Не, не прынца, не нейкага мільянера *(смяецца)*. А чалавека, якому змагу даверыцца, з якім мне лёгка і прыемна будзе ісці па жыцці. Мы пазнаёміліся ў Фэйсбуку, а пажаніліся літаральна праз два месяцы пасля першай сустрэчы. Муж з Ліды пераехаў жыць да мяне ў вёску, на Брэстчыну. І праз год у нас нарадзілася дачушка Агата, ёй днямі будзе тры месяцы. У вёсцы на мне ўжо даўно паставілі крыж. Маўляў, 40 гадоў, так і будзе ўвесь час выхоўваць чужых дзяцей. Але, што прыемна, людзі, калі даведваліся, шчыра радаваліся за мяне, цэлы год пасля таго, як выйшла замуж, прымала віншаванні.

Алёна, нарадзіла двайнят у 42 гады: Мы з мужам 10 гадоў не маглі зацяжарыць. Хадзілі па дактарах, лячыліся. На адным з даследаванняў высветлілі, што звычайна зацяжарыць не ўдасца. Сталі разглядаць метад ЭКА. У нас было тры безвыніковыя спробы. Вырашылі, што чацвёртая будзе апошняй, бо гэта ўсё эмацыянальна вельмі складана. Кожны раз спадзявацца, а потым расчароўвацца. Нягледзячы на нпростую цяжарнасць, мы вельмі рады, што ў нас нарадзіліся два цудоўныя хлопчыкі. Вельмі доўга пра сваё шчасце наогул нікому не казалі, бо самі не маглі паверыць, што атрымалася.

Алеся, нарадзіла другога сына ў 40 гадоў: Калі мы разышліся з першым мужам, я спрабавала ўладкаваць сваё асабістае жыццё. Хадзіла да варажбіткі. Яна сказала, што ў мяне будзе позняе дзіця (на той момант у мяне ўжо быў адзін сын). Я ёй тады не паверыла. У маладосці ў мяне была пазаматачная цяжарнасць, і я даўно закрыла для сябе гэтую тэму. Тым больш дырэктар прапанаваў мне высокааплатную пасаду, і ў сферу маіх інтарэсаў яшчэ адно дзіця не ўваходзіла. І вось праз нейкі час на рабоце я пазнаёмілася з калегам, малодшым за мяне на дзевяць гадоў. Мы з ім пачалі сустракацца. Калі зразумела, што зацяжарыла, прыняла рашэнне нараджаць, незалежна ад таго, пагодзіцца мой малады чалавек вытрымкі ці не.

Розніца паміж старэйшай і малодшай дачкамі Ірыны ЯБЛОНСКАЙ — 20 гадоў.

Ірына Яблонская, урач-дыетолаг, нарадзіла другое дзіця за тры месяцы да свайго 40-годдзя: Я трэці раз выйшла замуж. За свайго былога аднакурсніка. Праўда, блізка пазнаёмілася з ім толькі пры падрыхтоўцы да вечара сустрэч выпускнікоў. Мы хацелі сумеснае дзіця. Таму абследаваліся і прымалі па схеме ўсе неабходныя нутрыцэўтыкі для падрыхтоўкі да цяжарнасці. Мы абое медыкі, таму разумеем, наколькі гэта важна. І ў нас усё вельмі хутка атрымалася.

Вольга Пякун, псіхолаг, дырэктар сямейнага цэнтра «Маміна школа», нарадзіла чацвёртае дзіця ў 41 год: «У мяне было 13 цяжарнасцяў. І толькі чацвёра родаў. Я прайшла многае, у тым ліку і журботнае, але заўсёды ведала, што ў мяне будзе шмат дзяцей. І не факт, што чацвёртае дзіця апошняе. Нашы дзеці — узнагарода для нас з мужам. Такія, ведаеце, цяжкадасягальныя медалі. Сёння мы дзякуем Богу, дактарам, бацькам, сябрам за падтрымку, дапамогу і за тое, што ў нас усё атрымалася».

«У дырэктара быў шок, калі я сказала, што чакаю дзіця»

— Што адчулі, калі даведаліся, што зацяжарылі? Як адрэагавалі блізкія, калегі? Што пра познюю цяжарнасць гаварылі ўрачы?

Ала: «Было радасна і страшна адначасова. Але зараз магу сказаць: прымаўка «Бог дае дзіця — дае і на дзіця» працуе. І спаць мне не хацелася, і памочнікаў не хацелася. Многія былі супраць, каб я нараджала. 14 гадоў таму познія роды былі не так распаўсюджаны, як цяпер. Людзі на вуліцы глядзелі коса. Я ўдзячна свайму старэйшаму сыну (яму на той момант было 18), які сказаў: «Мама, гэта так крута!» Муж быў у камандзіроўцы. Пазваніла яму, кажу: «Валодзя, я цяжарная». Доўгае маўчанне. А потым: «Прыеду — паразмаўляем». Яго аргументы, што мы старыя, хворыя і не вырасцім гэтае дзіця, на мяне не дзейнічалі. Ведала, што ніколі не пайду на аборт. Зараз муж з малодшым сынам — найлепшыя сябры».

Таццяна: «Мая мама ў 42 гады стала бабуляй, а я яшчэ збіралася стаць мамай. Вядома, адразу спалохалася. Пра ўзрост думала. Пра тое, што, калі сын скончыць школу, мне будзе 60...»

Вольга: «Асабіста я не адчуваю свой пашпартны ўзрост. Нашай сям'і 23 гады, і ўвесь гэты час мы вядзём актыўны лад жыцця, вандруем, займаемся спортам. Дзеці — гэта насамрэч рэсурс: калі правільна імі карыстацца (гэта ў нас такі жарт). Яны не толькі працягваюць маладосць сваім бацькам, але і для бабуль і дзядуль цудоўны антыдэпрэсант, пры якім ты не можаш быць хворым і старым. Калі дзеці збіраюцца ў госці да маіх бацькоў, заўсёды кажу: унукі едуць аздараўляць бабулю і дзядулю».

Ала: «Памятаю, мы гулялі сям'ёй па горадзе. Я заскочыла ў краму. А муж каляску качаў, бо Цімафей, відаць, заплакаў. Побач стаялі старэйшыя дзеці. Міма праходзіў калега мужа і кажа: «Слухай, аддай ты дзіця бацькам». А муж смяецца: «Я ж і ёсць бацька».

Алеся: «Самае складанае для мяне было паведаміць навіну дырэктару. Бо ён браў мяне з улікам таго, што мне пад 40, і кар'ера ў прыярытэце. Калі на навагоднім карпаратыве я яму сказала: «Прабачце, я вас так падвяла», ён быў у шоку. Праўда, у дэкрэтным водпуску я не была ніводнага дня!»

Наталля, нарадзіла чацвёртае дзіця ў 43 гады: «Калі я прыйшла да гінеколага і сказала, што думаю пра чацвёртае дзіця, мяне адгаворвалі. Казалі, што цяжарыць у такім узросце — вялікая рызыка. Не сакрэт, што пасля 40 большая верагоднасць нарадзіць хворае дзіця, чым у 20 ці 30 гадоў. Таму мне прапанавалі зрабіць амнеацэнтэз (аналіз для «старанараджаючых», які дазваляе выявіць генетычныя паталогіі плода). Я адмовілася, бо не бачыла ў гэтым сэнсу. Навошта рабіць прокол жывата, калі ўсе аналізы і УГД добрыя. Мне сказалі: «Жанчына, чым вы думаеце? У вашым узросце верагоднасць 1:20, што ў вас народзіцца даўн». На што я адказала: «Нават калі так, я не збіраюся рабіць аборт». Разумею, што медыкі перастраховаюцца. Але, калі шчыра, не вельмі прыемна, калі з табой размаўляюць такім тонам, тым больш у такім уразлівым стане».

«Пасля нараджэння дачкі мы з мужам практычна не спалі тры гады»

— Ёсць розніца паміж цяжарнасцю і родамі ў 20 і ў 40 гадоў?

Наталля: «Так атрымалася, што чацвёртая цяжарнасць была самай лёгкай. Дачушка нарадзілася здаровенькая, нават вышэй за ўсіх маіх дзяцей па шкале Апгар — 8/9 балаў».

Алена: «Усё прайшло спакойна, роўна, без ніякіх праблем. Можа, з-за таго, што я жыву на прыродзе, на свежым паветры».

Алеся: «Усю цяжарнасць адхадзіла нармальна. Цікавае становішча надавала мне маладжавасці, нават валасы «закаласіліся». За месяц да родаў сустрэліся з сябрамі ў піцэрыі. Мне чамусьці было вельмі весела: смяялася так, што не магла спыніцца. Скончылася ўсё тым, што ў мяне адышлі воды і я паехала ў радзільню. На месяц раней. Гэта дадало праблем у плане здароўя дзіцяці. Мы з гіпаксіяй трапілі ў рэанімацыю. Было страшна. Дзякуй Богу, выкараскаліся, зараз дзіцяці 9 гадоў. Усё цудоўна. Мы з маім маладым чалавекам распісаліся. Пра другое дзіця не думаю, бо ўзрост ужо не дазваляе, хоць сын перыядычна просіць сястрычку».

Ірына: «Падчас цяжарнасці, асабліва ў сорак гадоў, могуць павылазіць рэчы, якіх наогул ніколі не было. У прыватнасці, у мяне з'явіўся аўтаімунны цірэаідыт. Я страціла шмат сіл, энергіі і сродкаў на навучанне, каб пазбавіць сябе ад гэтага захворвання, і цяпер з задавальненнем дапамагаю іншым жанчынам. Падчас абедзвюх цяжарнасцяў я моцна набірала вагу. Пасля першых родаў лішнія кілаграмы так хутка сышлі, што я нават не прыкмеціла. Цяпер жа ў мяне на аднаўленне сышоў не адзін год, вельмі цяжка пазбаўлялася ад 27 кілаграмаў, што набрала за другую цяжарнасць. Акрамя таго, пасля нараджэння Зосі мы з мужам практычна не спалі тры гады. Бяссонныя ночы пасля 40 — гэта цяжка. Таму трэба не саромецца, прасіць дапамогі. Дзіцяці патрэбна здаровая мама. Значыць, важна збалансавана харчавацца. Часта мамы забываюцца пра гэта, бо засяроджаны на дзіцяці. У выніку ўзнікаюць яшчэ большыя праблемы са здароўем».

Вольга: «Кожная цяжарнасць была лягчэйшая за папярэднюю і больш уражвала сваёй рэалізацыяй. Пасля трэцяга кесарава я выпісалася на трэція суткі. Пасля чацвёртага таксама хутка аднавілася. Заўсёды на кансультацыях кажу сваім клиенткам: вялікая верагоднасць, што роды, як і ваша цяжарнасць, пройдуць па сцэнарыі, які вы намалюеце ў сваёй галаве. Першых дваіх дзяцей я нараджала пад агульным наркозам, і мне іх выдавалі. Чацвёртая ж дачка нарадзілася шляхам мяккага кесаравага сячэння: я тужылася, у нас быў кантакт скура да скуры, Аксінню прыклалі да маёй грудзі і толькі потым перарэзалі пупавіну. Я папрасіла максімальна наблізіць натуральныя роды, бо ў мяне іх ніколі не было. Пажартавала: буду хадзіць да вас нараджаць, пакуль не нараджу сама. Доктар мяне пачула і дапамагла пражыць гэты стан. Я была ў той момант неверагодна шчаслівая!»

Вольга ПЯКУН, псіхолаг: «Зараджайцеся станоўчым досведам іншых і працуйце са сваімі страхамі»

— Падчас цяжарнасці павышаецца пачуццё адказнасці, а з ім прыходзяць страхі, якія перашкаджаюць нам радавацца свайму чароўнаму стану. Працуйце са страхамі. Калі баіцеся, што народзіцца хворае дзіця, прапрацаваць гэта можна альбо са спецыялістам, альбо самастойна, заручыўшыся падтрымкай дактароў, абследаваннямі.

Чытайце станоўчыя водгукі і кантактуйце з тымі, у каго быў пазітыўны досвед. Цяжарная жанчына вельмі ўразлівая. Калі мы ўпускаем у сябе негатыў, хваляванні ўзмацняюцца, і не выключана, што думкі могуць матэрыялізавацца. Райцеся з тымі, у каго ўсё атрымалася. А яшчэ важна знайсці доктара, які будзе падтрымліваць, а не пужаць.

— Як змянілася ваша жыццё пасля нараджэння дзіцяці?

Наталля: «Са з'яўленнем чацвёртай дачкі ў мяне адкрыліся новыя таленты. Я заўсёды хацела знайсці для сябе нейкае хобі, аддушыну. Але нічога надоўга не захоплівала. Калі дачушка нарадзілася, я завяла кніжны блог, дзе распавядаю пра дзіцячыя кнігі і настольныя гульні. Гэта месца, дзе адпачываю, знаёмлюся з цікавымі людзьмі-аднадумцамі».

Таццяна: «Мой муж як тата адназначна пасталеў. Калі адлучала першае дзіця ад грудзей, яго падтрымкі не адчувала. Як хочаш, так і змагайся з дзіцем усю ноч. Тут жа муж сам прапанаваў дапамогу. Застаўся з маленькім дома. А мы са старэйшым сынам пайшлі начаваць да маёй мамы».

Ірына: «Калі нарадзіла старэйшую дачку, я вучылася ў медуніверсітэце на 3-м курсе. Да трох гадоў Меліса расла з маёй мамай і бабуляй у Гомелі. А я давучвалася ў Мінску. Таму першыя тры гады, можна сказаць, прайшлі міма мяне. Я, канешне, наведвала дачку па выхадных і на канікулы яе забірала. Але такога шчыльнага кантакту з маленькай, як цяпер, не было. Зося ж на маіх вачах пайшла, на маіх вачах папаўзла, на маіх вачах загаварыла. Гэта вельмі каштоўны досвед. І я шчаслівая, што мне давялося ўсё гэта перажыць».

Вольга: «Я кармлю грудзямі да самаадлучэння, нашу ў слінгу і бясконца дзякую дзецям, што выбралі мяне сваёй мамай. Цяжарнасць 40 + не дыягназ. Гэта дар».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
Фота Вольгі МІКУЛЬСКАЙ.

Апошнім часам усё часцей жанчыны нараджаюць ва ўзросце ад 40 да 44 гадоў. І больш як 50 працэнтаў гэтых дзяцей — трэція і наступныя.

* Імёны некаторых гераінь зменены па іх просьбе.

Ірына ЯБЛОНСКАЯ, урач-дыетолаг: «Правядзіце поўны чэк-ап свайго арганізма»

— Рэкамендую рыхтавацца да зачацця ў любым узросце, а ў 40-гадовым — тым больш, бо здароўе будучага дзіцяці мы закладваем менавіта падчас падрыхтоўкі да цяжарнасці. Перш чым ісці на гэты крок, неабходна правесці поўны чэк-ап (комплекснае абследаванне) свайго арганізма, здаць аналізы абодвум партнёрам. Акрамя таго, каб цяжарнасць працякала спрыяльна, трэба пралячыць хранічныя захворванні. Таму што іх абвастрэнне можа прывесці да нядобрых наступстваў. З узростам і рызыкі ўзрастаюць, гэта праўда, таму пажадана «ісці ў цяжарнасць», мінімізаваўшы іх.

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«Выбирай стиль «ТЕРРАНОВА» с Айфон 13»

Наименование Рекламной игры: «Выбирай стиль «ТЕРРАНОВА» с Айфон 13» (далее – Рекламная игра). Зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь, свидетельство № 4129 от 15.12.2021 г.

Организатор Рекламной игры: общество с ограниченной ответственностью «ПЛЭЙ МОДА» (зарегистрированное 01.11.2007 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190891956).

Местонахождение Организатора Рекламной игры: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 5, пом. 13, офис 410.

Сроки проведения Рекламной игры: начало 25.12.2021 г., окончание 31.01.2022 г.

Территория проведения Рекламной игры: магазин «TERRANOVA», расположенный в торгово-развлекательном центре «Galileo», г. Минске, ул. Бобруйская, 6.

Призовой фонд Рекламной игры разыгран в полном объеме.

В Рекламной игре приняли участие 27 участников.

Результаты проведения Рекламной игры:

1. Подарочный сертификат в кафе «Балкон» выиграла Назарова Татьяна Сергеевна.

2. Беспроводные наушники (AirPods (3rd generation) Model A2565 A2564 A2566) выиграла Короткевич Ольга Александровна.

3. Мобильный телефон (iPhone 13 128GB Midnight Model A2635) выиграла Грук Мария Леонидовна.

Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 22 февраля 2022 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости – автозаправочной станции, принадлежащего открытому акционерному обществу «Речицкий межрайавтотранспорт» на праве собственности

Лот № 1: автозаправочная станция, инв. № 340/С-313184. Адрес объекта: Гомельская обл., Речицкий р-н, Жмуровский с/с, д. Пригородная, ул. Урожайная, 5В. Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции). Одноэтажное кирпичное здание, год постройки 1974. Общая площадь 13,7 кв. м. Составные части и принадлежности: два крыльца, три ограждения, калитка, двое ворот

Начальная цена лота: 57 240,00 руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %).
Задаток: 5 724,00 руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

Земельный участок для обслуживания автозаправочной станции на праве постоянного пользования площадью **0,5260 га** с кадастровым номером **3245501000010012 15.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 21 февраля 2022 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

